

ЯК ТРЭНІРУЮЦЦА САПЁРЫ 4

КОЛЬКІ «ЭКА» Ў АГРАТУРЫЗМЕ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 11 (28878)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVпраграма

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віталь ГРЫЦЭВІЧ, намеснік дырэктара дэпартамента па турызме — начальнік аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Міністэрства спорту і турызму:**

*«Праект абноўленага закона аб турызме планауецца ўнесці на восеньскую сесію парламента. Гэта глабальны дакумент, які трэба падрыхтаваць сёлета. Міністэрства спорту і турызму ўжо правяло шэраг абмеркаванняў і круглых сталоў, дзе разглядаліся прапанаваныя змены. Магу сказаць, што ўзнікаюць гарачыя спрэчкі па ключавых момантах: як размеркаваць абавязкі і адказнасць тураператара і турагента, як павінен быць абаронены турыст (напрыклад, страхаванне альбо абавязковая «фінансавая падушка» для выплат). Напэўна, вырашэнне гэтых пытанняў і падрыхтоўка законапраекта не будуць такімі простымі».*

# ПОЗІРК НА ПОЎДЗЕНЬ АФРЫКІ

### Учора Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Дамбудза Мнангагвам



Фота БелТА.

**Пасля ўрачыстай цырымоніі ў Палацы Незалежнасці адбыліся перагаворы кіраўнікоў дзяржаў у вузкім складзе, а некалькі пазней — у шырокім.**

## У пошуку стратэгічных партнёраў

На сустрэчы ў вузкім складзе кіраўнік нашай дзяржавы павітаў калегу і членаў зімбабвійскай дэлегацыі на беларускай зямлі і нагадаў, што некалькі гадоў таму сустракаўся з прэзідэнтам Зімбабвэ, калі той займаў пасаду першага віцэ-прэзідэнта. Беларускі лідар павіншаваў яго з перамогай на выбарах і пажадаў выканаць тыя абяцанні, якія былі дадзены ў працэсе передвыбарнай кампаніі народу.

«Вы выдатна разумееце, што мы не гіганцкая краіна і, вядома ж, супрацоўнічаць з усімі краінамі Афрыкі на глыбокай аснове не можам. Таму мы спрабуем знайсці тых, з кім маглі б выбудаваць стратэгічнае партнёрства», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Беларусь вельмі эфектыўна супрацоўнічае з краінамі паўночнай Афрыкі — перш за ўсё з Егіптам, Алжырам, а ў цэнтральнай Афрыцы наша краіна з даўніх часоў праце з Суданам.

СТАР. 2

Інжынер-эколаг Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» Ларыса КУЛАК робіць агляд драўляных скульптур жывёл на экалагічнай сцяжыне, якая праходзіць уздоўж ракі Іслач.

# У зубрыным кутку



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- ВУП Беларусі ў 2018 годзе годзе вырас на 3 % у параўнанні з 2017 годам.
- **Беларусь увайшла ў топ-20 краін з самымі прыгожымі жанчынамі.**
- Тыдзень беларускай кухні пройдзе ў Мінску з 25 лютага да 3 сакавіка.



- **Абноўленыя праграмы гуманітарных прадметаў у ВНУ Беларусі ўвядуць у 2019/2020 навучальным годзе.**
- Турцыя, Егіпет, Украіна, Расія засталіся самымі папулярнымі краінамі ў беларускіх турыстаў у 2018 годзе.

ISSN 1990 - 763X

Жыллё маё

# КУПІЦЬ НЕРУХОМАСЦЬ У КРЭДЫТ БУДЗЕ СКЛАДАНЕЙ

### Чаму крэдыты на будаўніцтва сталі менш даступныя?

**Нягледзячы на стабільнасць стаўкі рэфінансавання, якая з чэрвеня мінулага года знаходзіцца на ўзроўні 10 %, у апошнім квартале 2018 года пачаўся рост ставак па крэдытах на будаўніцтва і куплю нерухомасці. Чаму гэта адбылося і як гэты факт можа паўплываць на развіццё цэнавых тэндэнцый на рынку жылля?**

## Шэсць банкаў паднялі стаўкі

Па інфармацыі сектара іпатэчнага крэдытавання агенцтва нерухомасці «Твая сталіца», сярод фінансавых інстытутаў, якія павялічылі стаўкі па крэдытах у канцы мінулага года былі:

— БПС-Ашчадбанк — з 15 % да 16,1 % на куплю і будаўніцтва;

— БелВЭБ — з 14 % да 15 % на куплю і будаўніцтва (а ў гэтым месяцы стаўка вырасла яшчэ — да 15,5 %);

— Прiорбанк — з 14 % да 16,1 % (другі і наступныя гады) на куплю і будаўніцтва;

— Беларускі народны банк — з 15,5 % да 15,99 % на куплю;

— Франсабанк — з 14 % да 15,5 % на куплю;

— Белінвестбанк — з 14,95 % да 16,1 % на куплю і будаўніцтва, а таксама адмяніў зніжэнне стаўкі на 1 % для катэгорыі тых, хто мае патрэбу.

Калі рост ставак па прапанових ад банкаў склаў ад 0,49 % да 2,1 %, то набыццё гатовых навабудоўляў у лізінг падаражэла на 0,5 — 4 %. Так, кампанія «Райффайзен-лізінг» павысіла стаўкі з 15,5 % да 16 % як на гатовыя навабудоўлі, так і на кватэры другаснага рынку, а арганізацыя «ААБ-Лізінг» падняла іх з 13 % да 17 % толькі на гатовае новае жыллё.

Але на росце ставак усё не скончылася. Самы буйны банк краіны прыпыніў выдачу крэдытаў на куплю гатовай нерухомасці (засталіся толькі на будаўніцтва). Пры гэтым дэдлайн крэдытнай паўзы Беларусбанка першапачаткова быў вызначаны на канец мінулага года, але з надыходам новага фінансавага перыяду ён працягнуўся ўжо да канца студзеня.

СТАР. 4

# ПОЗІРК НА ПОЎДЗЕНЬ АФРЫКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы хацелі б мець вельмі цеснае ўзаемадзеянне з дзяржавамі Паўднёвай Афрыкі. Мы бачым вялікі фронт работы для Беларусі ў Зімбабвэ, — заявіў ён. — Нам трэба выбудаваць стратэгію супрацоўніцтва, вызначыць канкрэтны план. Мы стварылі міждзяржаўную групу спецыялістаў. Хацелася б, каб з вашага боку былі эфектыўныя людзі ў гэтай групе, тады, спланаваўшы нашу работу на будучыню, мы зможам вырашыць многія пытанні ў інтарэсах вашага народа».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў Беларусі добра ведаюць магчымасці Зімбабвэ, роўна як і ў Зімбабвэ ведаюць нашы. Беларускі лідар прызнаў, што ёсць пэўныя цяжкасці ў двухбаковых адносінах, але «не пераадолець гэтыя цяжкасці могуць толькі тыя, хто не спрабуе гэта зрабіць». «Калі мы паставім перад сабой мэту — абавязкова рэалізуем тыя праекты, якія ўжо бачым», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў беларускага лідара, Зімбабвэ перажывае нялёгкія часы, але іх перажывала і Беларусь больш за 20 гадоў таму. Любая краіна, якая спрабуе ўдасканальваць і развіваць уласную эканоміку і грамадства, праходзіць гэты складаны этап, лічыць беларускі Прэзідэнт. «Мы хацелі б, каб вы як мага хутчэй пераадолелі ўсе ўнутрыпалітычныя і ўнутрыэканамічныя складанасці. Вы павінны памятаць, што мы будзем спрыяць гэтаму ўсяляк», — сказаў кіраўнік Беларусі.

Таксама ён назваў умову для свайго візіту ў Зімбабвэ. «Спадар Прэзідэнт, я, вядома ж, з вялікім задавальненнем прыеду да вас у краіну, але да гэтага прыезду мы павінны дамовіцца аб чатырох-пяці канкрэтных кантрактах, праектах, якія рэалізуем у Зімбабвэ. Такіх праектах, якія б пабачыў увесь зімбабвійскі народ», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У адказ Прэзідэнт Зімбабвэ падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за асабістую падтрымку ў нялёгкія для краіны часы. На яго думку, паміж дзяржавамі склаліся добрыя, вельмі цесныя адносіны, больш за тое, зімбабвійскі народ разглядае Беларусь як брацкую краіну.

## Нашы магчымасці — вашы прапановы

«Значны патэнцыял узаемадзеяння шмат у чым яшчэ не рэалізаваны. У найбліжэйшыя гады гэта трэба будзе зрабіць, асабліва ў сферах гандлю і эканомікі, — сказаў беларускі лідар падчас афіцыйных перагавораў у пашыраным складзе. — Вы вельмі ёмістa вызначылі шлях развіцця краіны, заявіўшы сусветнай супольнасці, што «Зімбабвэ адкрыта для бізнесу». Мяркуем, што такі падыход станоўча адаб'ецца на рэалізацыі беларуска-зімбабвійскіх сумесных праектаў».

Ён звярнуў увагу, што ў Зімбабвэ паставілі задачу за кароткі тэрмін вывесці краіну на лідзіруючыя пазіцыі ў Афрыцы па тэмпах эканамічнага росту, у чым можа дапамагчы Беларусь.

У 2018 годзе было заключана некалькі шматмільённых кантрактаў на экспарт у Зімбабвэ беларускай тэхнікі пры фінансавай падтрымцы беларускага Банка развіцця і зімбабвійскага рэзервовага банка. Чакаецца, што пасля ўзгаднення ўсіх міжбанкаўскіх працэдур пачнуцца пастаўкі ў адпаведнасці з гэтымі дамоўленасцямі.

Шырокія магчымасці для ўзаемадзеяння дзвюх краін даюць унікальныя ландшафтна-прыродныя, мінеральна-сыравінныя і рэкрэацыйныя рэсурсы Зімбабвэ. Таму перспектыўным можа стаць удзел беларускіх кампаній ва ўзвядзенні гідраэнергетычных аб'ектаў, будаўніцтве «пад ключ» электрастанцый на сонечных панэлях, геолагаразведцы і распрацоўцы радовішчаў карысных выкапняў.

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што актыўна развіваецца ўзаемадзеянне і ў гуманітарнай сферы. Дасягнуты дамоўленасці аб міжвузаўскім абмене, аб атрыманні зімбабвійцамі ў Беларусі вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, вядучыя арганізацыі аховы здароўя Беларусі могуць аказваць грамадзянам Зімбабвэ высокатэхналагічную медыцынскую дапамогу.

Стварэнне беларуска-зімбабвійскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве будзе стымуляваць рэалізацыю намечаных планаў, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Для хуткай і якаснай працы над інвестпраектамі, сумеснымі праектамі неабходны прамыя кантакты і наладжаныя камунікацыі паміж міністэрствамі, арганізацыямі і кампаніямі. Варта праяўляць максімальную ўвагу да прапаноў, што паступаюць з абодвух бакоў. Толькі так мы зможам дамагчыся жаданага выніку, — заявіў ён. — Дзелавыя колы, асацыяцыі бізнесменаў, гандлёва-прамысловыя палаты дзвюх дзяржаў таксама павінны стаць важнымі элементамі ў працэсе фарміравання новых сумесных праектаў».

Прэзідэнт падкрэсліў: наша краіна гатова да прадметнага абмеркавання напрамкаў узаемадзеяння для павелічэння двухбаковага тавараабароту і пашырэння ўзаемавыгаднага партнёрства.

## Спалучэнне інтарэсаў

Вынікі перагавораў з зімбабвійскай дэлегацыяй кіраўнік беларускай дзяржавы падвёў падчас выступлення перад прадстаўнікамі СМІ.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Беларусь разглядае Зімбабвэ як важнага партнёра ў рэгіёне Паўднёвай Афрыкі. Адносіны паміж дзвюма краінамі можна ахарактарызаваць як дружалюбныя і ўзаемавыгадныя.

«Мы імкнёмся рухацца далей і прыйсці да больш сучасных і шматпланавых эканамічных адносін, чым проста гандаль», — адзначыў ён.

З гэтай мэтай бакі абмеркавалі перспектывы рэалізацыі ў Зімбабвэ інвестыцыйных і сумесных праектаў у сферах сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, транспартнай інфраструктуры, энергетыкі, геолагаразведкі і здабычы карысных выкапняў.

Беларусь зацікаўлена ў прасоўванні сваіх паслуг, тэхнікі і абсталявання ў рамках розных праектаў. Пра абсталяванне вельмі шмат казаў Прэзідэнт Зімбабвэ, асабліва ў сферы горна-здабывальнай прамысловасці. Наша краіна гатова да стварэння машынабудаўнічага прадпрыемства і мяса-малочнага комплексу, да развіцця дарожнай інфраструктуры і распрацоўкі радовішчаў карысных выкапняў, да супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, аховы здароўя.

«Мы зыходзім з таго, што нарошчванне і дыверсіфікацыя беларускага экспарту ў Зімбабвэ павінны адказваць агульным інтарэсам, у тым ліку спрыяць эканамічнаму развіццю краіны. Перад нашымі партнёрамі вострa стаяць задачы па індустрыялізацыі краіны, развіцці сельскай гаспадаркі, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў», — расказаў Прэзідэнт. Такі падыход беларускі бок лічыць узаемавыгадным і бяспройгрышным для абодвух партнёраў.

Вынікі сустрэчы Аляксандр Лукашэнка ацаніў як плённыя, таму што было шмат тэм для прадметнай гутаркі, дасягнуты пэўныя дамоўленасці.

Па выніках перагавораў было падпісана восем дакументаў — дагавор і мемарандумы ў сферах права, адукацыі, навукі, тэхналогій, інавацый і сельскай гаспадаркі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

На парадку дня

# Орша: унікальны шанц для рэгіёна

**Магчымасцю скарыстацца льготамі Указа Прэзідэнта № 506 аб развіцці Аршаншчыны ўжо зацікавіліся бізнесмены. Пра тое, як найбольш эфектыўна выканаць указ, днямі ішла размова ў Віцебскім аблвыканкаме.**

Паводле слоў **першага намесніка старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргея ПАЦА,** у першы ж рабочы дзень новага года дзелавыя людзі пачалі звяртацца па каментарыі, інфармацыйныя даведкі, парады. Напрыклад, наконт таго, як сертыфікаваць прадукцыю і паслугі, як працаваць на льготных умовах. Інтарэс назіраецца не толькі з боку мясцовых прадпрымальнікаў, яго праяўляюць прадстаўнікі бізнесу з Віцебска і сталіцы. (Дарэчы, на наступны дзень у Віцебску арганізавалі сустрэчу і з кіраўнікамі суб'ектаў недзяржаўнага сектара эканомікі.) Прадстаўнік райвыканкама выказаў меркаванне, што і замежныя інвестары таксама будуць зацікаўлены ўкласці грошы ў развіццё рэгіёна, бо зарабіць можна параўнальна больш, эканомячы пры выплаце падаткаў. Ёсць і іншыя прэферэнцыі.

**Начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Віцебскай вобласці Валерый ЛАБАЦЭВІЧ** нагадаў, што бонусы гарантаваныя не ўсім. У прыватнасці, калі будзе весціся выключна гандаль, ніякіх паслабленняў чакаць не даводзіцца. А вось, напрыклад, калі прадпрыемства ці індывідуальны прадпрымальнік, зарэгістраваныя ў Аршанскім рэгіёне, выпрабляюць там прадукцыю, аказваюць паслугі, то гарантуецца памяншэнне падатковай стаўкі...

Падаткавік выказаў надзею, што павелічэнне падатковай выручкі — гэта стабільныя паступленні ў бюджэт, якія будуць павялічвацца. Так, сам узровень падаткаў знізіцца, але тых, хто іх заплаціць, будзе больш. Адпаведна, і дзяржаве гэта больш выгадна.

Зразумела, у першую чаргу жыхары рэгіёна чакаюць, што з'явяцца новыя рабочыя месцы і годныя заробкі. Як канстатавала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Ірына МАТВЕЕВА,** летась 780 чалавек атрымалі работу. І сёлета гэта магчымасць з'явіцца амаль у 800 жыхароў раёна. Для іх ствараюцца рабочыя месцы на новых вытворчасцях і за кошт мадэрнізацыі існуючых.

Зарплата павінна быць напрамую звязана з прадукцыйнасцю працы, пра што не раз гаварыў і Прэзідэнт. Гэтае пытанне — у цэнтры ўвагі мясцовай улады, як і адпаведнасць новых рабочых месцаў патрабаванням часу.

**Першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ** канстатаваў, што кіраўнік краіны сваім указам дае ўнікальную магчымасць развіцця Аршаншчыны. Гэта датычыцца і фінансавай дапамогі з рэспубліканскага бюджэту.

Праграму развіцця рэгіёна трэба рэалізаваць да канца 2023 года. «Эканамічны эксперымент» праводзіцца для таго, каб потым адпрацаванае рэалізаваць у іншых рэгіёнах. Галоўная ж мэта — павышэнне ўзроўню дабрабыту жыхароў глыбінкі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Польшча пабудуе востраў у Калінінградскім заліве




Польшча пабудуе штучны востраў у Калінінградскім заліве. Аб гэтым паведамляе польскае выданне Onet, спасылаючыся на тэндарную дакументацыю ўрадавых структур. Востраў з'явіцца ў тэрытарыяльных водах Польшчы. Для яго стварэння будуць выкарыстоўваць грунт, які атрымаюць пры будаўніцтве суднаходнага канала праз Балтыйскую касу. Паведамляецца, што востраў будзе ўзведзены на вышыні 2—3 метраў на ўзроўні мора, ён будзе мець форму эліпса з даўжынёй каля двух кіламетраў і шырынёй каля аднаго. Па звестках выдання, аб'ект не будуць выкарыстоўваць у турыстычных мэтах. Яго будаўніцтва ацэньваецца ў 880 мільёнаў польскіх злотых (каля 234 мільёнаў долараў). Востраў узвядуць у рамках ажыццяўлення праграмы будаўніцтва воднага шляху, які злучае Калінінградскі заліў з Гданьскім залівам. У адпаведнасці з планам, яе рэалізацыя дазволіць суднам марскіх параметраў заходзіць у польскі порт Эльбланг.

## Ствараецца найбуйнейшы золатаздабытчык у свеце



Амерыканская горназдабыўная карпарацыя Newmont Mining і канадская Goldcorp дамовіліся аб зліцці, каб стаць найбуйнейшым золатаздабытчыкам у свеце. Партнёры па здзелцы абмяняюцца акцыямі на агульную суму 10 мільярдаў долараў, перадае ТАСС. «У выніку аб'яднання мы створым самае перадавое прадпрыемства ў галіне золатаздабычы, якое валодае найлепшымі актывамі, кадрамі і магчымасцямі», — прыводзяцца ў заяве Newmont Mining словы яе кіраўніка Гэры Голдберга. Аб'яднаная карпарацыя будзе называцца Newmont Goldcorp. Кампаніі плануюць завяршыць працэс інтэграцыі да канца гэтага года, пасля чаго Голдберг саступіць кіраўніцтва Newmont Goldcorp Тому Палмеру, які зараз займае пасаду выканаўчага дырэктара Newmont Mining. Паводле ацэнак амерыканскіх экспертаў, Newmont Mining у перыяд з 2015 да 2018 года займала лідзіруючыя пазіцыі ў галіне здабычы золата і медзі. Кампанія працуе на тэрыторыі ЗША, Аўстраліі, Ганы, Перу і Сурынама. У 2017 годзе яна здабыла 5,3 мільёна унцый золата, Goldcorp — 2,6 мільёна. Чакаецца, што аб'ём вытворчасці аб'яднанай карпарацыі ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі складзе 6—7 мільёнаў унцый каштоўнага металу ў год.

## Катар выдзеліць 20 мільёнаў долараў на вяртанне мігрантаў з Лівіі дадому

Катар дапаможа ў вырашэнні праблемы нелегальнай міграцыі ў Еўрасаюз і створыць фонд з капіталам у 20 мільёнаў долараў на вяртанне дадому з Лівіі нелегальных мігрантаў з Афрыкі. Аб гэтым паведаміў міністр замежных спраў краіны Мухамед бен Абдэрахман Аль Тані. Раней эмір Катара Тамім бен Хамад Аль Тані выпусціў указ аб стварэнні спецыяльнага фонду пад эгідай Афрыканскага саюза для пакрыцця выдаткаў па эвакуацыі нелегальных мігрантаў з Лівіі ў іх краіны і рэінтэграцыі. Ён правёў перагаворы са старшынёй Камісіі Афрасаюза Мусой Факі Махаматам. «Гэтая ініцыятыва эміра Катара накіравана на барацьбу з нелегальнай міграцыяй з дапамогай рэінтэграцыі ахвяр нелегальнай міграцыі і гандлю людзьмі ў супольнасці краін, адкуль яны родам», — сказаў кіраўнік МЗС пасля падпісання пагаднення паміж катарскім фондам развіцця і Афрасаюзам аб выдзяленні гранта. Раней прэм'ер-міністр урада нацыянальнай згоды Лівіі Фаіз Сарадж паведаміў, што цяпер у краіне знаходзяцца сотні тысяч нелегальных мігрантаў з краін Азіі і Афрыкі, якія імкнуцца адтуль трапіць у Еўрасаюз. Краіны ЕС прапанавалі стварыць на тэрыторыі Лівіі цэнтры прыёму бежанцаў.

Даходы

# Як зарабіць пенсію самазанятым

**Чаму ім важна планаваць сваю пенсійную будучыню ўжо сёння і што для гэтага трэба, расказалі прадстаўнікі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**



Указам № 500 «Аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні» дадзена права ўдзельнічаць у дзяржаўным сацыяльным страхаванні самазанятым грамадзянам, дзейнасць якіх не адносіцца да прадпрымальніцкай. А ІП, натарыусы і адвакаты змогуць выплачваць гэтыя ўзносы толькі за перыяд фактычнага ажыццяўлення сваёй дзейнасці з атрыманнем даходу. Таксама ўрэгуляваны пытанні забеспячэння правоў і гарантый у галіне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання некаторых іншых катэгорый грамадзян.

Па звестках падатковай службы, у краіне каля 37 тысяч самазанятых асоб, — столькі чалавек заплацілі адзіны падатак.

Каб у іх з'явілася права на пенсію, ім трэба адлічаць у бюджэт фонду 29 % ад сумы мінімальнай заработнай платы. Мінімальны месячны плацеж для гэтай катэгорыі, з улікам велічыні МЗП у студзені 2019 года, складзе 95,7 рубля.

«Мы будзем весці інфармацыйна-тлумачальную работу сярод такіх грамадзян аб неабходнасці фарміравання свайго страхавога стажу», — адзначыў у прэс-цэнтры БелТА **начальнік упраўлення метадалогіі збору плацяжоў і прафесійнага пенсійнага страхавання ФСАН Уладзімір КЛІМЧАНКА.** Ён падкрэсліў, што цікавасць да ўказа з боку самазанятых была вялікая яшчэ ў перыяд абмеркавання дакумента. А ў першыя два тыдні пасля яго выхаду ў органы фонду звярнуліся больш за 200 чалавек па тлумачэнні аб парадку і сумах выплаты.

Дарэчы, цяпер у нашай краіне 3,6 тысячы чалавек атрымліваюць сацыяльную пенсію, паколькі не сфарміравалі неабходнага страхавога стажу. **Кіраўнік ФСАН Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** лічыць, што па магчымасці сума ўзносаў павінна быць больш за мінімальную (з прывязкай да МЗП), таму што калі выплачваць унёскі 20 гадоў ад мінімальнай заработнай платы, то мінімальная працоўная пенсія па ўзросце складзе 216 рублёў. У тых грамадзян, якія не сфарміравалі свой страхавы стаж, на сёння памер сацыяльнай пенсіі — 50 % БПМ, ці 107 рублёў.

Да 2014 года страхавы стаж, які ўлічваецца пры вызначэнні права на працоўную пенсію, складаў пяць гадоў, затым яго павялічылі да 10, а пасля да 15 гадоў. Цяпер працягваецца пастулапнае павышэнне страхавога стажу — штогод на паўгода, каб да 2025-га ён дасягнуў 20 гадоў. Беларусы, якім не ўдалося яго напрацаваць, могуць аформіць сацыяльную пенсію па дасягненні імі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШЛЯХ НАРОДА

## Вучоныя падрыхтавалі пяцітомнік па гісторыі беларускай дзяржаўнасці

Беларусам часта не хапае ведаў пра паходжанне і развіццё свайго этнасу. Каб выправіць сітуацыю, у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук ужо не першы год вядуцца даследаванні, звязаныя з такой праблематыкай. Як паведаміў **дырэктар гэтага інстытута Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ,** распрацавана канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці. У новай грунтоўнай працы даследчыкі ўпершыню прадстаўляюць абагуленую гісторыю, дзе расказваецца аб станаўленні дзяржаўнасці ад старажытнасці да нашых дзён.




— У гэтай кнізе паказаны ўвесь той складаны шлях, які прайшлі тысячы пакаленняў беларускага народа, каб сёння жыць у незалежнай рэспубліцы. Беларусь ніколі не была каланіяльнай тэрыторыяй. Беларускі этнас, знаходзячыся ў складзе Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага,Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, заўсёды выступаў як складальная частка дзяржаваўтрымальнага працэсу. Гэта нам удалося паказаць на аснове найбагацейшага археалагічнага матэрыялу і інфармацыі, выяўленай у архівах краін Еўропы, Расіі. Мы павінны гаварыць, што беларусы — народ, які насуперак усім цяжкасцям захаваў сваю мову, культуру, традыцыі і набыў дзяржаўнасць, — заўважыў **акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.**

Ужо ўбачыў свет першы ілюстраваны том, што ахоплівае часы да канца XVIII стагоддзя, які і былі прадстаўлены навукоўцамі. Над ім працавалі 29 аўтараў, сярод якіх не толькі супрацоўнікі Інстытута гісторыі, але і выкладчыкі вядучых ВНУ краіны.

Вучоныя доўга спрачаліся, што трэба падаваць у гэтым даследаванні, і вырашылі, што нельга не закрануць тыя часы, калі тэрыторыя Беларусі толькі пачала засяляцца. У выданні паказана, як асвойвалася тэрыторыя. Так, дакладна вядома, што першыя людзі тут з'явіліся каля ста тысяч гадоў таму, але, дзякуючы найноўшым археалагічным даследаванням, ужо можна сцвярджаць, што на поўдні нашай краіны гэта адбылося прыкладна 250 тысяч гадоў таму. У Іванаўскім раёне адкрыта новае месцазнаходжанне каменных артэфактаў. Гэта адно з самых найстаражытных пасяленняў на тэрыторыі Еўропы.

Археолагамі былі знойдзены і антрапалагічныя матэрыялы, якія далі падставу для рэканструкцыі. І сёння мы можам ведаць, як выглядалі нашы далёкія продкі. У кнізе асвятляюцца ўсе найноўшыя даследаванні беларускіх вучоных.

У выданні навукоўцы даказваюць, што фарміраванне дзяржаўнасці на нашых землях пачынаецца ў IX стагоддзі. Уласна, чаму адлік ідзе менавіта з гэтага часу? У той таму, што летапісец згадвае пра Полацк і плямёны, якія жылі на нашых землях, — заўважае **загадчыца цэнтра Інстытута гісторыі Вольга ЛЯЎКО.** — Сама назва плямён сведчыць, што сфарміраваліся нейкія больш-менш пастаянныя тэрыторыі, на якіх пражывала шчыльна звязанае эканамічнымі і культурнымі інтарэсамі насельніцтва, і яно сябе ўжо ўсведамляла ўладарамі пэўнай тэрыторыі і адстойвала інтарэсы. Да сярэдзіны IX стагоддзя гэты працэс ахапіў усю ўсходнюю Еўропу. І тут на гэтым фоне вымалёўваецца тры буйныя цэнтры славянскага насельніцтва — Ноўгарад, Кіеў і Полацк. Неабходна было даказаць, што Полацк быў такім жа раўназначным цэнтрам, як і два іншыя, якія пасля склалі адзіную дзяржаву — Кіеўскую Русь».

Новае выданне павінна стаць настольнай кнігай усіх, хто адказвае за фарміраванне ідэалогіі. Ужо сёння распрацоўваюцца вучэбныя праграмы курсаў па гісторыі беларускай дзяржаўнасці для студэнтаў ВНУ.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**




# 3 гісторыі — у сучаснасць

**Стагоддзе з дня ўтварэння БССР адзначылі ў Магілёве маштабным канцэртам і ўшанаваннем лепшых.**

Шэраг прадстаўнікоў розных галін дзейнасці былі ўзнагароджаны памятнымі медалямі за ўклад у развіццё вобласці, яшчэ пяць жанчын атрымалі ордэны Маці за выхаванне пяці і болей дзяцей. Сярод тых, каму ўручылі ўзнагароды, Герой Сацыялістычнай Працы Аляксандр Байкоў, поўныя кавалеры ордэнаў Працоўнай Славы Людміла Палевіч і Ніна Пятрэнка.

Дамінантай свята стаў маштабны тэатралізаваны канцэрт на сцэне Палаца культуры вобласці. Творчыя калектывы зрабілі рэканструкцыю галоўных падзей з жыцця вобласці, а на экране тым часам дэманстраваліся кадры з гераічнага мінулага. Будоўлі стагоддзя, бязлітасная вайна, гераічная абарона Магілёва, аднаўленне — усё гэта прайшло чырвонай ніткай перад вачамі магіляўчан за некалькі гадзін відовішчнага канцэрта.

Магілёўская вобласць, дарэчы, з'явілася на карце Савецкага Саюза таксама 15 студзеня, але на год раней. З яе існаваннем звязана шмат значных і лёсавызначальных падзей. За свае ратныя і працоўныя подзвігі Магілёў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны першай ступені, Бабруйск — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а вобласць — ордэнам Леніна. У 1991 годзе Магілёўшчына стала часткай суверэннай Беларусі. Сёння Прыдняпроўскі край валодае значным шматгаліновым экспартна-арыентаваным прамысловым патэнцыялам і з'яўляецца адным з найбуйнейшых культурных рэгіёнаў Беларусі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## МАГЧЫМАСЦЬ ВЫКАЗАЦЦА

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 19 студзеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні ў суботу з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# У ВЫХАДНЫЯ ЗЛЁГКУ ПАДМАРОЗІЦЬ

## А ўначы на аўторак чакаецца да мінус 18 градусаў

**З пачатку тыдня ў краіне адзначалася воблачнае з ападкамі надвор'е, а тэмпературны фон утрымліваўся на 1—5 градусаў вышэй за кліматычную норму. У пятніцу захаваецца ў асноўным цёплае надвор'е, але на выхадных тэмпература паветра пачне паступова паніжацца, і на наступным тыдні ўсталюецца марознае надвор'е, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Невялікі мароз будзе і на выхадных. У суботу і нядзелю чакаецца ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовы снег, будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 градусаў ніжэй за нуль, месцамі пры праясненнях яна панізіцца да 10—12 марозу. Удзень чакаецца ад нуля да мінус 6 градусаў. У панядзелак уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, днём месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да мінус 10 градусаў, пры праясненнях пераважна на поўдні краіны — 11—14 марозу. Удзень будзе 2—9 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у аўторак у асобных раёнах краіны чакаецца невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да мінус 12 градусаў, а пры праясненнях — ад мінус 13 да мінус 18 градусаў. Удзень будзе ад мінус 3 да 11 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Жыццё сталіцы

# Гораду — квітнець і развівацца

**У Мінску на 2019 год запланавана вялікая рэканструкцыя паркаў і сквераў, паведаміў генеральны дырэктар УП «Мінскзеленбуд» Ігар КУШНЯРЭВІЧ.**

Працягнецца работа па рэканструкцыі паркаў імя Уга Чавеса і імя Міхаіла Паўлава. Прыкладна ў чэрвені-ліпені яна будзе скончана.

— Асобна, — адзначыў Ігар Кушнярэвіч, — хочацца спыніцца на парку Горкага. Згодна з даручэннем Прэзідэнта, летась намі была ўстаноўлена канцэпцыя па развіцці гэтага парку. Яна налічвае каля 20 пазіцый, па якіх мы будзем працаваць. Мы так збіраемся прыбраць кіёскі з набярэжнай, якія абураюць жыхароў горада, у асобную гандлёвую зону. Акрамя таго, сама набярэжная будзе рэстаўравацца, асабліва ў раёне Палаца шлюбаў, дзе яна найбольш дэфармаваная. Таксама мы хочам замяніць частку атракцыёнаў. Будзе праводзіцца рамонт дарожнай сеткі. Разглядаецца пытанне арганізацыі асобнай дзіцячай пляцоўкі. Правядзём рамонт асвятлення, у тым ліку і на коле агляду. Надпісу «Мінск» на ім ужо пятнаццаць гадоў, і сёлета мы плануем гэты надпіс цалкам абнавіць.

Таксама будуць праводзіцца работы на Сляпянскай воднай сістэме. Яна была пабудавана ў 60-я гады мінулага стагоддзя, і ў некаторых раёнах частка набярэжных ляжыць у вадзе. Прыйшоў час капітальна яе рамантаваць. Што датычыцца знакамітых 15-ці каскадаў, то і яны чакаюць свайго рамонту.

Як яшчэ расказаў Ігар Анатолевіч, вялікая ўвага будзе аддадзена кветкаваму афармленню горада. Плануецца пасадзіць каля 2 220 тысяч кветак. У 2018 годзе з'явілася вялікая колькасць малых архітэктурных формаў — гэта кветачніцы, урны, карэты, чашы. У 2019 годзе будзе набыта яшчэ 2400 гэтых прадметаў вулічнага ўпрыгожвання.

Як заўсёды, у горадзе будзе высаджвацца вялікая колькасць дрэў і кустоў. У 2019 годзе вырашылі зрабіць акцэнт на дваровых тэрыторыях. Плануецца шырока прыцягваць да пасадкі дрэў навакольных дамоў.

— Асноўная наша задача, — сказаў Ігар Кушнярэвіч, — гэта бягучае ўтрыманне горада. А з улікам таго, што нас чакаюць ІІ-я Еўрапейскія гульні, мы падымем яго на самую высокую планку.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

Аты-баты

# САПЁРЫ ХОДЗЯЦЬ ПАВОЛЬНА

**Больш за 22 тысячы выбухованебяспечных прадметаў на тэрыторыі Беларусі абясшкодзілі летась рухомыя групы размініравання. Больш за ўсё «сюрпрызаў» з часоў Вялікай Айчыннай вайны было знойдзена і нейтралізавана ў Докшыцкім, Талачынскім, Асіповіцкім і Лагойскім раёнах. Гэтая лічба была агучана падчас збору па размініраванні з начальнікамі інжынерных службаў, камандзірамі воінскіх часцей інжынерных войскаў і прадстаўнікамі ваенных камісарыятаў, які прайшоў у 2-й інжынернай брыгадзе.**






— Самы вялікі «ўлоў» быў у раёне чыгуначнай станцыі Круляўшчызна. Там знойдзены былі склад артылерыйскіх боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Мясцовыя жыхары расказалі, што ў 1941-м, падчас адступлення, чырвонаармейцы склад падпалілі, але пайшоў дождж, і ён патушыў агонь. Калі ў 1944-м адступалі немцы, то яны гэты склад падарвалі, з-за чаго шмат снарадаў разляцелася па мясцовасці. Летась там было знішчана каля 13 тысяч небяспечных прадметаў, — зазначыў **начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл палкоўнік Андрэй КУРАКОЎ.**

Летась на ўзбраенне інжынерных войскаў паступілі новыя ўзоры тэхнікі, узбраення і экіпіроўкі. Напрыклад, касцюм «Сокал» важыць восем з паловай кілаграмаў. Ён здольны абараніць байца ад выбуху супрацьпяхотнай міны, пры гэтым дазваляе свабодна працаваць. А вось касцюм «Даспехі» падыме ўжо не кожны чалавек: яго маса складае ажно 66 кілаграмаў! Але і функцыянал яго адпаведны. Па-першае, выбух да двух кілаграмаў узрыўчаткі байцу, экіпіраванаму «Даспехамі», не страшны зусім. Па-другое, браніраваныя пласціны стрымаюць асколкі, якія ляцяць з хуткасцю да двух кіламетраў за гадзіну. Унутры яго ёсць сістэмы ахаладжэння, сувязі і вентыляцыі. Прадугледжана магчымасць падключэння і па правадах, калі праціўнік скарыстае радыёэлектронную барацьбу.

Істотна мадэрнізаваны і класічны атрыбут любога сапёра — мінашукальнікі. Старыя прылады могуць знайсці боепрыпас на глыбіні не больш за 40 сантыметраў. Цяпер жа ў інжынерныя войскі прыйшлі спецыялізаваныя дэтэктары Garret GTI 2500, якія працуюць на адлегласць да чатырох метраў. Яшчэ адна навінка — аўтамабіль «Дракон». Па ўсім перыметры на ім усталяваны спецыяльныя працікумулятыўныя рашоткі.



**Дарэчы**

**Сёлета 2-я інжынерная брыгада адзначыць 100-ы дзень нараджэння. У далёкім 1919 годзе ў Маскве была сфарміравана запасная ваенна-маскіровачная рота. Цяпер жа яна дыслакуецца ў пасёлку Сосны на ўскраіне Мінска.**

Але не толькі размініраваннем займаюцца інжынерныя войскі. Напрыклад, амаль год яны ўтрымлівалі наплаўны мост каля Жыткавіч праз Прыпяць. І гэта пры тым, што звычайна пантонны мост «раскочваецца» на суткі або двое, паколькі служыць толькі для адной мэты — пропуску войскаў праз водныя перашкоды. Акрамя таго, вайскоўцы ўзвялі пяць нізкаводных драўляных мастоў праз іншыя рэкі — Пціч, Нёман, Шчару... Прычым робяць яны гэта вельмі хутка. Калі ўсе матэрыялы ёсць у наяўнасці, то за пяць, максімум дзесяць дзён пабудаваць мост даўжынёй у паўсотню метраў цалкам рэальна.

А першага лістапада, летась, у 2-й інжынернай брыгадзе была створана адмысловая супрацьмінная служба. Яна прызначана рыхтаваць спецыялістаў па размініраванні і ачыстцы мясцовасці, аб'ектаў і акваторыі ад выбухованебяспечных прадметаў.

...На рахунку **камандзіра разведвальна-вадалазнага ўзвода сёмага інжынернага палка старшага лейтэнанта Арцёма ШАВУРЫ** — больш за тры тысячы абясшкоджаных боепрыпасаў толькі за мінулы год.

— Усе знаходкі ўяўлялі вельмі вялікую небяспеку, — кажа вайсковец. — Яны праляжалі ў зямлі з часоў вайны. Траплялася многае: ад ручных гранат да артылерыйскіх снарадаў калібрам 280 мм для марціры. Дастаткова сказаць, што вага іх перавышае 200 кілаграмаў. Прыкладна 50 кілаграмаў выпадае на долю ўзрыўчаткі. Плюс улічыце, што ва ўсе боепрыпасы ўстаўлены ўзрывальнікі. А за дзесяцігоддзі, якія яны праляжалі ў зямлі, іх да таго ж моцна пашкодзіла карозія. Радыус разлёту асколкаў у іх — да паўкіламетра. Самы нязначны неасцярожны рух — і што будзе далей, невядома. Таму спецыялісты ходзяць вельмі павольна...

Разам з тым сапёры знаходзяць не толькі боепрыпасы. Напрыклад, паблізу той жа станцыі Круляўшчызна была знойдзена бляха салдата царскай арміі, як мяркуецца, 1850-х гадоў. Яе перадалі ў музей 7-га інжынернага палка. Было ўстаноўлена, што такія бляхі 160 гадоў таму насілі артылерысты.

Сапёры трэніруюцца ў спецыялізаваным вучэбнатрэніровачным комплексе. Ён уяўляе сабой спецыяльныя класы, пераабсталяваныя пад розныя пакоі. Але нават ручку ўваходных дзвярэй трэба націскаць толькі пасля праверкі: не выключана, што можа прагучаць выбух. Ён паказвае, што сапёр пралічыўся. А памыляецца ён, як вядома, толькі адзін раз.

— Нашы навучальныя класы адмыслова зроблены так, каб падрыхтаваць байцоў да розных магчымых сітуацый, — кажа Андрэй Куракоў. — Давайце праверым гэта ў рэальнасці.

Заходзім у першы клас. Ён нагадвае пакой у дзіцячым садку. Стаяць мяккія цацкі, шафкі, ложкі і нават маленькі тэлевізар. Здаецца, што тут можа быць падазронага? Але нехта з журналістаў адчыняе дзверы адной з шафкі — і тут жа гучыць аглушальны выбух, а ў паветры патыхае нейкай кіслаціной. То спрацаваў халасты зарад. Яшчэ адна граната прытаілася пад бяскрыўднай мяккай цацкай.

Наступны клас імітуе армейскі склад. Па легендзе, на яго напалі бандыты, забілі салдата і паставілі тут міну. Адразу пры ўваходзе ў вочы кідаецца вельмі рэалістычны манекен, які ўяўляе цела байца. Вось толькі спяшацца да яго Андрэй Куракоў не раіць. І сапраўды: вока заўважае нейкі нацягнуты дрот зусім блізка ад манекена. Гэта імітатар расцяжкі.

— Мы вывучалі пры гэтым досвед, атрыманы падчас замежных канфліктаў. Напрыклад, былі выпадкі, калі тэрарысты мініравалі нават целы. Любая спроба ссунуць мёртвага — выбух.

А вось у трэцім пакоі ўсё яшчэ больш мудрагеліста, чым у першых двух. Абсталявана ўсё, як у звычайным пакоі, дзе стаіць ложак, секцыя, тумбачка, тэлевізар. Тут расцяжка пастаўлена паміж ложкам і секцыяй. Але ці можна яе проста перарэзаць?

— Калі вы так зробіце, то падарвяцеся, — кажа Андрэй Куракоў. — Тут дрот — гэта пастка, якая заклікана адцягнуць увагу. Асноўны зарад закладзены ў тумбачцы. Як толькі вы перарэжаце дрот — ён і спрацоўвае. Але гэта яшчэ не ўсё. Звярніце ўвагу: за тэлевізарам схаваны артылерыйскі снарад. Узрываецца, як толькі апарат уключаецца...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# КУПІЦЬ НЕРУХОМАСЦЬ У КРЭДЫТ БУДЗЕ СКЛАДАНЕЙ

## Сталі браць меншыя сумы



Сітуацыю каментуе **кіраўнік сектара іпатэчнага крэдытавання агенцтва Людміла СЯМЁНАВА:**

— Безумоўна, у параўнанні з пачаткам мінулага года цяпер атрымаць крэдыт стала складаней. У прыватнасці, пры павелічэнні працэнтнай стаўкі ўзрастаюць плацяжы па крэдыце і адпаведна банкі прад'яўляюць больш высокія патрабаванні да даходаў сваіх кліентаў.

Няўжо сітуацыя змянілася настолькі, што цяпер крэдыты сталі наогул недаступныя? Не, проста цяпер варта разлічваць на іншыя, меншыя сумы, чым гэта было яшчэ год таму. Па заяўках, якія паступілі ў канцы года, можна канстатаваць, што цікавасць да крэдытаў застаецца стабільнай.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не выключана, што значны аб'ём заявак прадугледжвае асаблівыя (менш, чым на агульным рынку) стаўкі для кліентаў ад шэрагу банкаў, якія супрацоўнічаюць з арганізатарамі будаўніцтва. Тут банкі атрымліваюць частку свайго прыбытку ад кампаніі-забудоўшчыка. Цяпер крэдыт для набыцця кватэры ў новабудоўлі разлічваюць атрымаць больш за 40 % пакупнікоў, а для набыцця кватэры на другасным рынку — каля 30 %. Найбольш папулярныя для гэтага такія банкі, як Беларусбанк, БелВЭБ, Пріорбанк і Белінвестбанк.

Людміла Сямёнава лічыць, што ў перспектыве найбліжэйшых месяцаў падаражанне крэдытаў не павінна аказаць значнага ўплыву на кошт жылля: чакаць яго зніжэння не варта. Але таксама трэба разумець, што рост цэн на нерухомасць, які адзначаўся ў апошні год, грунтаваўся менавіта на «патаннелых» крэдытах. І таму, калі ў далейшым стаўкі будуць расці ці ўмовы выдачы крэдытаў стануць больш жорсткімі, то не выключана, што цэны на кватэры пачнуць зніжацца.

## Збіць ажыятаж або атрымаць максімум выгады?

Чаму банкі аднachасова павялічылі стаўкі па крэдытах на нерухомасць? Тут існуе некалькі меркаванняў. У лістападзе мінулага года ў сілу ўступіў абноўлены Банкаўскі кодэкс. Многія яго пункты датычацца крэдытаў і дэпазітаў. Напрыклад, банкі цяпер не маюць права ў аднабаковым парадку павялічыць стаўку па ўжо выдадзеным крэдыце. Выключэнне складаюць выпадкі, калі дагаворам устаноўлена пераменная працэнтная стаўка, прывязаная да паказчыка, змены якога адбываюцца незалежна ад банка.

Іншымі словамі, калі стаўка па вашым крэдыце залежыць ад стаўкі рэфінансавання і апошняя раптам павысілася, то і крэдыт таксама падаражэе. А калі ў дагаворы пазначана канкрэтная стаўка, то павысіць яе ў аднабаковым парадку банк не зможа.

Акрамя таго, некаторыя крэдыты ідуць «з нагрузкай» — дадатковымі платнымі паслугамі, скажам, страхоўкай. Цяпер кліенты змогуць самі выбраць абсалютна любога страхоўшчыка ці наогул ад гэтага адмовіцца.

Дадзеныя змены, на думку фінансавых аналітыкаў, істотна падкарэктавалі «апетыты» банкіраў. Таму яны і вырашылі напрасту павысіць стаўкі. Бо іншых, больш хітрых і схаваных «накрутак» па крэдытах рабіць ужо нельга.

Праўда, ёсць і іншае меркаванне. Да сярэдзіны мінулага года менавіта фізічныя асобы набралі велізарную колькасць крэдытаў. Звычайныя спажывецкія крэдыты часам людзі афармляюць не думаючы, а значыць аддаваць іх будзе цяжка. «Доўгія» і неабдуманыя пазыкі пад нерухомасць могуць стаць, пры іх масавасці, непад'ёмнай праблемай не толькі для асобна ўзятай сям'і, а нават цэлага рэгіёна, ды і краіны ў цэлым. У Амерыцы ў свой час гэта выклікала іпатэчны крызіс. Падобную магчымую праблему для нашай краіны нібыта разгледзеў Нацбанк і ветліва папрасіў камерцыйныя банкі зрабіць так, каб небагатыя (тыя, у каго маленькія даходы) людзі не маглі браць вялікія грошы ў доўг. Магчыма, ісціна дзесьці пасярэдзіне.

**Сяргей КУРКАЧ.**




## ПАДАРУНАК З СЮРПРЫЗАМ

...Барыс быў не проста рыбаком, а рыбаком апантаным. За тыя грошы, што ён трациў на розныя рыбацкія «цацкі», па разліках зайздроснага суседа, можна было есці фарэль, прычым кожны дзень. Барыс жа карміў сваіх тым, што зловіць, і сям'я, што цікава, з задавальненнем ела, бо ёй, відаць, важна было, што чалавек мае занятак для душы, а гэта, як вядома, важней за грошы. Таму Люба — жонка Барыса — яго ніколі не «пілавала»: зносіла неяк частыя адлучкі, з ахвотай чысціла рыбу.

Ці трэба казаць, што муж быў ёй вельмі ўдзячны і таму ў вольны час — ад работы і рыбалкі — усяляк стараўся дапамагчы.

Карацей, жылі яны добра, а сталі — яшчэ лепш, калі...

У пятніцу перад Калядамі, у дзень нараджэння жонкі, гаспадар з самай раніцы адправіўся на возера: свежая рыбка на святочным стале — што можа быць лепей?! Ну і падарунак...

На гэты раз Барыс купіў сваёй Любе пярсцёнак. Ён ведаў, які, бо разам з жонкай, хоць зрэдку, але зазіраў у ювелірны аддзел універмага, бачыў, да чаго яна прыглядаецца, што мерае, што лёгка аддае назад прадавачцы, а што — з пякучай тугой.

«Падсекшы» яе, апошнюю, муж пазычыў грошай, выкупіў упадабаную жонкай рэч і з нецярпеннем стаў чакаць таго дня, калі зможа ўручыць. І тады Люба спачатку знямее ад здзіўлення, потым надзене пярсцёначак на свой прыгожы пальчык, потым, ну, вядома ж, павісне ў яго на шыі.

...Клёву доўгі час не было. Хлопцы каля лунак ужо абмеркавалі палітычную абстаноўку ў далёкім і блізкім замежжы, агучылі ўсе новыя і нават «барадатыя» анекдоты, выпілі ўсю каву і гарбату, што бралі ў тэрмасах, адчулі, што стала халадаць.

Як водзіцца, у некага «з сабой было». Трохі пагрэліся. Па дабаўку паслалі ганца, а Барыс — крыху захмялелы ў прадчуваннях — выраашыў пахваліцца пакупкай: выцягнуў з глыбокай кішэні пярсцёнак, паклаў яго на далонь і, здаецца, тут жа пачуў: «Бора, клюе!»

Забыўшыся на ўсё, як той мядзведзь у сваім рыбацкім касцюме, ён кінуўся да лункі, схапіў вудзільна і... У гэта ж імгненне адчуў, як зацісінуты ў кулак пярсцёнак выслізнуў адтуль і боўтнуў у злашчасную лунку.

Маржаваннем ніхто з яго сяброў не займаўся. Ды і шукаць на дне возера, пад цёмнай вадой чатыры грамы золата, — відаць, куды горш, чым у стозе іголку.

Спахмурнеў рыбак. І не столькі з-за грошай — з-за таго, што ў Любы (а значыць, і ў яго) не будзе радасці.

...Добра, што хоць клёў з'явіўся: хвілін праз колькі з той лункі, куды «нырнуў» падарунак, Барыс дастаў здаравеннага, кілаграмаў на пяць, шчупака, іншай рыбы — таксама.

Факт, што дамоў з'явіўся з поўным заплечнікам.

У якасці падарунка паднёс Любе таго шчупака ды сціплыя духі (купіў па дарозе... На рэштki заначкі)...

Жонка, дзякаваць богу, з ахвотай прыняла (дарагі не абед) і, пацалаваўшы мужа, стала чысціць рыбу, як раптам...

На стале, пад нажом нешта бліснула... Што?.. Ды быць не можа!? «Барыс, — гукнула мужа, — мусіць, я сплю?»

У руках яна трымала пярсцёнак.

— Не, не спіш, — знайшоўся тым часам муж. — Гэта мой табе падарунак — з сюрпрызам...

Для каго ён быў большы — для Любы, якая падумала, што муж зла-віў шчупака і ў пашчу яму запіхнуў пярсцёнак, ці для Барыса, які не мог апамятацца ад радасці, — гісторыя замоўчвае. Мне ж засталося толькі дадаць, што цуды здараюцца! А навагоднія ды калядныя — найчасцей.

**Алена Несцяронак,**
*г. Докшыцы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***АД ЯЕ Ж.*** Па-першае, шчырыя прабачэнні ўсім, хто летась не чытаў, не выпісваў нашу газету або не захаваў пятнічныя старонкі і зараз не можа зайсці на сайт, каб даведацца, аб чым канкрэтна пойдзе размова.

Па-другое, гэтым жа людзям трэба нагадаць, што гісторыі чытачоў — вясёлыя і праўдзівыя — не проста друкуюцца, а бяруць удзел у конкурсе на самую лепшую, і што вызначае іх найперш вялікае чытацкае журы, сябрам якога становіцца кожны, хто ў канцы ці пачатку года дасылае нам сваю выніковую дзясятку (не рублёў, як вы разумееце, а гісторый, якія спадабаліся найбольш). Такім чынам...

*«Я, можна сказаць, жыву ад пятніцы да пятніцы, каб даведацца, што на гэты раз напішуць нашы чытачы. Усе іхнія гісторыі заслугоўваюць увагі. Шмат сярод іх вельмі смешных, шмат павучальных, і шкада, што выбраць трэба толькі дзясятак,* — прызнаецца, дасылаючы спіс, **спадарыня Вера Клімовіч са Стаўбцоўшчыны.**

*«Разам з суседкай і мужам мы перачыталі ўсю рубрыку «Народ на провадзе» і вырашылі, што найлепшымі варта прызнаць «Не такі страшны чорт...» Таццяны Халопіцы («Звязда», 16.02.), «Чаго не зробіш, кахаючы» Любові Чыгрынавай (10.03.), «Дзярэць? Хай дзярэць!» Ігара Пракаповіча (20.04), «Рухавік падвёў» Івана Сіманёнка (4.05.), «Дзед Янук і Мурчуня» А. Полаз з Вілейшчыны (18.05), «Трыста грамаў чарнаслiву» Валянціны Паліканінай (15.06), «Міравы суддзя» Любові Міхайлавай (10.08), «Такі быў час і такія людзі» Соф'і Кусянковай (14.09), «Хімік» Ніны Кандрашонак (23.11),* — пералічвае **спадарыня Лілія Скіндзер з Івацэвічаў.** *— Сярод іх не найгоршай была і мая гісторыя «Хто яму капае, той сам туды і трапляе», надрукаваная 12 студзеня. А ўвогуле цяжка выбраць лепшыя».*

| Условия, связанные с использованием земельного участка, а также иные условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | направление возможного использования земельного участка до сноса (до 2022 года) расположенного на нем объекта по существующему назначению: для эксплуатации и обслуживания здания специализированного для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции);<br>в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды данного земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;<br>обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>при продлении срока аренды земельного участка до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 3 500 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB 36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Минского городского исполнительного комитета.<br>Назначение платежа – **задаток для участия в аукционе** |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 18 февраля 2019 г. до 16.00.**

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минским городским исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский городской исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским городским исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Минского городского исполнительного комитета от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским городским исполнительным комитетом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества может быть предоставлена покупателю по его письменному заявлению на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Информация об аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных Интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (www.minsk.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www. gki.gov.by)

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні не варта кідацца ў крайнасці. Прыслухайцеся да свайго ўнутранага голасу, ён абяцае падказаць правільнае рашэнне па самых складаных пытаннях. У панядзелак і аўторак рэкамендуецца засяродзіцца на руцінных задачах. У чацвер варта прадэманстраваць начальству ваша ўменне працаваць, менавіта ў гэты дзень яно будзе схільнае ацаніць вашу стараннасць. У пятніцу абставіны могуць стацца занадта супярэчлівымі, каб прымаць нейкія рашэнні. Змагацца не варта, ёсць сэнс даверыцца бегу падзей. У выхадныя дні ўсё стане на свае месцы.

**ЦЯЛЕЦ.** Зараз спрыяльны час для павышэння па службе або пошуку больш даходнай работы. Ваша добрасумленнасць дазволіць дамагчыся практычна ўсіх пастаўленых мэт. У сераду паспрабуйце не навязваць сям'і сваё меркаванне, гэта можа прывесці да канфліктнай сітуацыі. У выхадныя дні абстаноўка дома будзе супакойваць.

**БЛІЗНЯТЫ.** Надыходзячы тыдзень прынясе выдатны настрой і забяспечыць магчымасць для самарэалізацыі. У аўторак можа скласціся спрыяльная сітуацыя для ажыццяўлення бізнес-планаў. У чацвер будзьце ўважлівыя, каб не выпусціць цікавыя ідэі і надзейных дзелавых партнёраў. Любы чалавек здолее парадаваць, вы будзеце ім ганарыцца. У выхадныя атмасфера ў доме будзе практычна ідэальная.

**РАК.** Не адкладайце справы на потым, бо можаце з імі з лёгкасцю справіцца якраз на гэтым тыдні. У вас удалы перыяд. Будуць усе шанцы дамагчыся ад любога суразмоўніка разумення. Зможаце скарыць сэрца прадстаўніка супрацьлеглага полу. У выхадныя не забывайце вылучыць час для адпачынку.

**ЛЕЎ.** Панядзелак не абяцае асаблівай ласкі зорак, так што пажадана знізіць тэмп дзелавога жыцця. Затое зможаце ўзяць рэванш у наступныя дні, калі перад напорам вашай энергіі не змогуць устаяць усе абмежаванні і перашкоды. У сераду не варта баяцца пераменаў у асабістым жыцці, хоць разлічваць давядзецца толькі на ўласныя сілы.

**ДЗЕВА.** Надыходзіць час сумненняў. Падобна на тое, вы не ведаеце, як правільна зрабіць. Праявіце мудрасць і абачлівасць у рашэннях, ад гэтага можа залежаць ваш лёс і лёсы іншых людзей. Гэта час для новых ідэй і планаў. Займіцеся самаразвіццём і самаўдасканаленнем. Толькі не растрачвайце адразу ўвесь рэсурс сіл, яны яшчэ спатрэбяцца ў будучыні.

**ШАЛІ.** Для вас можа стаць актуальным філасофскае пытанне пра сэнс жыцця, толькі не замыкайцеся ў сваім унутраным свеце. Абмяркуйце з блізкімі людзьмі тое, што вас хвалюе. На гэтым тыдні можаце апынуцца ў незнаёмай абстаноўцы, і зноў давядзецца заваёўваць месца пад сонцам. Але калі такіх зменаў не прадбачыцца, то гэты час спрыяльны для правядзення важных перамоў, заключэння вельмі выгадных здзелак. У сярэдзіне тыдня будзьце асцярожныя, паспрабуйце прадчуваць непрыемнасці і абыходзіць іх бокам.

**СКАРПІЁН.** Ваш аптымізм з'явіцца залогам душэўнага спакою для вас і вашай сям'і. Так што прасцей не губляйце веру ў лепшае, і ўсё атрымаецца. Аўторак і серада могуць стацца лепшымі днямі для творчасці і пачатку новых праектаў. Каханне натхніць на новыя подзвігі і дазволіць атрымліваць задавальненне ад жыцця. У пятніцу і суботу верагодна прапанова, якая дасць магчымасць папоўніць вашы фінансавыя рэсурсы.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні для пераадолення перашкод, якія ўзнікаюць на вашым шляху, трэба ўжыць максімальна разумную тактыку. Кожнае дзеянне павінна быць старанна выверана, паспрабуйце не даваць волю эмоцыям. Субота — удалы момант для ажыццяўлення ідэй, якія датычацца змен у інтэр'еры. Толькі спачатку выдаткуйце некаторы час на тлумачэнне вашых задум тым, хто жыве разам з вамі.

**КАЗЯРОГ.** Ніякіх штампаў! Новы погляд на рэчы дазволіць сфармуляваць новыя ідэі. У вашых сілах змяніць у лепшы бок адносіны з навакольнымі. У аўторак лепш не ўступаць у спрэчкі, яны не прынясуць нічога канструктыўнага. У сераду спрыяльныя паездкі і камандзіроўкі, якія будуць вельмі паспяховыя. У выхадныя не забывайце пра блізкіх людзей, паспрабуйце аддаць ім больш часу.

**ВАДАЛІЎ.** Гэты тыдзень можа запатрабаваць ад вас максімальнага маральнага і фізічнага напружання. Накіруйце сваю энергію і сілы не на разбурэнне, а на стварэнне. Прыжаданні можна пазмагацца за справядлівасць, але толькі мірнымі сродкамі, патрабуйце свайго, але не перашчыруйце. У пятніцу магчымы прыемны сюрпрыз ад блізкага чалавека. Не забудзьцеся сказаць дзякуй.

**РЫБЫ.** Паспрабуйце прыцішыць свае амбіцыі. На гэтым тыдні будзеце занадта эмацыянальныя і нястрыманыя, каб іх хтосьці ўспрыняў сур'ёзна. У той жа час, у вас з'явіцца шанц згуртаваць вакол сябе сяброў і аднадумцаў. На рабоце будуць змены, неабходна адэкватна ацаніць становішча, якое склалася, і знайсці канструктыўныя метады для яго паляпшэння.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.17 | 17.23 | 8.06 |
| Віцебск — | 9.13 | 17.07 | 7.54 |
| Магілёў — | 9.07 | 17.13 | 8.06 |
| Гомель — | 8.57 | 17.17 | 8.20 |
| Гродна — | 9.31 | 17.40 | 8.09 |
| Брэст — | 9.25 | 17.47 | 8.22 |

### Месяц

*Першая квадра 14 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр.* Іосіфа, Рыгора, Яўгеніі.
*К.* Пятра, Хрысціны.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 18 СТУДЗЕНЯ

**У краіне**

**1044** год — у пісьмовых крыніцах з'явіліся першыя звесткі аб горадзе Навагрудку. У Іпацьеўскім летапісе горад (Новгород, Новогородок, Новый Городок) згадваецца ў 1252 годзе. Быў цэнтрам Чорнай Русі, Навагрудскага княства, рэзідэнцыяй вялікага князя літоўскага Міндоўга (тут ён каранаваўся і атрымаў тытул караля). У XIII стагоддзі Навагрудак — сталіца Вялікага Княства Літоўскага. У 1511-м горад атрымаў магдэбургскае права, а 18 мая 1595-га — афіцыйны герб: на чырвоным полі постаць Архангела Міхаіла ў чорным узбраенні з крыламі за спінай. У правай руцэ ён трымае меч, у левай — шалі.

**1879** год — нарадзіўся (вёска Каменная, цяпер у Брэсцкім раёне) Антон Іванавіч Лапацін, генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза. У Чырвонай Арміі з 1918-га. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года — камандуючы арміяй на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Паўночна-Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Войскі пад яго камандаваннем удзельнічалі ў вызваленні Беларусі, Прыбалтыкі, правядзенні Усходне-Прускай аперацыі. Падчас Беларускай аперацыі ўдзельнічаў у акружэнні віцебскай групоўкі праціўніка і вызваленні Віцебска. Вызначыўся пры ўзяцці горада Кёнігсберга. Удзельнік вайны з Японіяй на Далёкім Усходзе. Памёр у 1965 годзе.

**1900** год — нарадзіўся (г. Мінск) Віктар Іванавіч Баркоўскі, мовазнавец, акадэмік АН СССР, доктар філалагічных навук, прафесар. З 1950 года працаваў у Інстытуце мовазнаўства СССР (у 1954—1960 гадах — дырэктар). Даследаваў старажытнарускае пісьменства, гістарычную граматыку, сінтаксіс і дыялекталогію ўсходнеславянскіх моў, гісторыю айчыннага мовазнаўства. У 1930-я гады выступаў па пытаннях рэформы беларускага правапісу. Аўтар манаграфіі «Сінтаксіс казак: руска-беларускія паралелі», артыкула пра Я. Карскага і іншых. Рэдагаваў манаграфію Я. Карскага «Беларусы». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1982 годзе.

**1959** год — нарадзіўся Аляксандр Антонавіч Саладуха, беларускі эстрадны спявак. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь. У рэпертуары песні беларускіх і расійскіх кампазітараў.

**У свеце**

**1689** год — нарадзіўся Шарль Луі Мантэск'ё, французскі асветнік і правазнаўца. Памёр у 1755 годзе.

**1904** год — нарадзіўся (г. Саратаў) Барыс Андрэевіч Бабачкін, савецкі акцёр, рэжысёр, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, прафесар. Вядомым стаў дзякуючы беларускаму кіно. На кінастудыі «Савецкая Беларусь» Бабачкін зняўся ў трох найлепшых фільмах таго часу: «Вяртанне Нейтана Бекера» (1932), дзе яго партнёрам быў Саламон Міхоэлс, «Першы ўзвод» (1933) рэжысёра Корш-Сабліна, «Двойчы народжаны» (1934). Памёр у 1975 годзе.Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.



**1919** год — адбылася Парыжская мірная канферэнцыя, скліканая дзяржавамі — пераможцамі ў Першай сусветнай вайне для выпрацоўкі мірных дагавораў з пераможанымі краінамі. Канферэнцыя ўхваліла Статут Лігі Нацый.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Алё, Даша! Вы з'ехалі ў бар дзве гадзіны таму, і ў цябе да гэтага часу няма ні аднаго паста ў «Інстаграме». Вы наогул дабраліся?!**

Я са сваім катом размаўляю, як з чалавекам.

Ён ужо стаў разумець сутнасць чалавечага быцця. Перастаў мяўкаць. Гукі, якія ён выдае, усё часцей паходзяць на лаянку.

**Адэса, жонка — мужу:**

**— Сёмачка, я тут цукар шукала і знайшла ў дуле тваёй стрэльбы грошы. Што ты мне хацеў купіць, дарагі?**

Крызіс — гэта калі за тры дні да зарплаты заканчваецца мыла, зубная паста і кава, рвуцца апошнія калготкі, сыходзіць муж і кідае палюбоўнік.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 141.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

18 студзеня 2019 г. № 3 (488)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Напоўніць практычным сэнсам



Стварэнне асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў неабходна працягваць. стар. 2

### Яны выбіраюць аграсядзібу!



Доля замежных турыстаў, якія адпачываюць у беларускай вёсцы, расце. стар. 3

### Жыццёвая пазіцыя — актыўная



Фінансавае заахвочванне старэйшын хутчэй сімвалічнае. Ды і тое — па выніках работы за квартал. стар. 4

### Наваселле пад пагрозай



Чаму растуць «кватэрныя» чэргі на Гродзеншчыне. стар. 13

### Ад пераезду да пераезду



Гэта сям'я за 14 гадоў змяніла 12 месцаў жыхарства. стар. 16


ТЭМА ТЫДНЯ

# НА КІМ ВЁСКА ТРЫМАЕЦЦА




Старэйшына вёскі Адаменкі Валянціна Васілеўна ЗАМАСТОЦКАЯ *(злева)* і старшыня Лёзненскага сельскага Савета дэпутатаў Святлана ПУКАВА.

**Фотаздымак старэйшыны вёскі Адаменкі Лёзненскага раёна, Валянціны Васілеўны Замастоцкай, змешчаны на раённай Дошцы гонару. Жанчына аддала гэтай «пасадзе» больш за дзесяць гадоў.**

Да выхаду на пенсію яна працавала заатэхнікам-селекцыянерам і брыгадзірам жывёлагадоўчай фермы. З гумарам расказвае, што ездзіць па населеным пункце на «жыгулях-веласіпедзе», каб паспець усюды і да ўсіх, да каго трэба, бо ў Адаменках каля 500 жыхароў. Мае на ўвазе двухколавы транспарт. Не ўтойвае, што не ўсім падабаюцца яе пільнасць, просьбы навесці парадак, не злоўжываць спіртным, а ўзяцца за розум...

Амаль усе вяскоўцы паважаюць свайго старэйшыну за рэальныя справы. Напрыклад, разам з аднасяльчанамі дабілася таго, каб не закрывалі паштовае аддзяленне. Працуе яно цяпер, праўда, толькі тры дні на тыдзень. Але ж, на погляд старэйшыны, гэтага цалкам дастаткова.

— Так, да райцэнтра адсюль, як кажуць, рукой падаць. Можа, метраў 700—800, але ж старым цяжка ісці пешшу, а плаціць за праезд на аўтобусе шкада. Ды і дачакацца яго трэба...

— Да таго ж сама спрабавала адстаяць у Лёзне ў чарзе на пошце, каб камунальныя паслугі аплаціць. 1 гадзіну і 20 хвілін на гэта патраціла. А цяпер людзі рады, што «абаранілі» сваю пошту. Аўторак, чацвер і субота — паштовыя дні ў вёсцы. Нас гэта задавальняе, — кажа суразмоўніца.

стар. 4

ІНІЦЫЯТЫВА

# ЦЯПЕР НЕ ДА ГАДЖЭТАЎ

**Школьнікі з новага мікрараёна Гомеля на рэальным катку, а не ў віртуальнай прасторы змагаюцца за перамогу і гонар сваёй хакейнай каманды.**

— Цяпер проста нельга не стаць на канькі, — кажа матуля двух хлопчыкаў Кацярына Піскунова, якая толькі асвойвае катанне на новай лядовай пляцоўцы ў сваім двары. Тым больш малодшы — трохгадовы Елісей — ужо робіць першыя ўпартыя крокі на спецыяльных двухпалозных каньках.

Старэйшы — шасцігадовы Радзівон — ужо займаецца хакеем прафесійна, у Лядовым палацы на другім канцы горада. Але ж цяпер у хлопчыка ёсць магчымасць адточваць майстэрства непасрэдна пад вокнамі свайго дома. Новы каток знаходзіцца па вуліцы Пеняزькова, у агульным двары дамоў № 19, 23, 25 і 27.

Юныя хакеісты аматарскую пляцоўку ацанілі адразу: у сапраўдных крагах з клюшкамі яны зараз зацята рэжуць лёд. Робіць тайм-аўт толькі на абед і вячэру. Вечарам да спартыўных баёў далучаюцца таты — наладжваюць сямейныя хакейныя матчы накшталт «пад'езд на пад'езд».



За месяц пляцоўка-каўзанка стала вельмі папулярнай — пакатацца на ёй збіраецца натоўп з усяго новага мікрараёна Шведская горка. Гэта, між іншым, тры дзясяткі шматпавярховікаў.

стар. 2

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Разгляд на месцы

**Сёння, 18 студзеня, у Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці праходзіць выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні на тэму «Фарміраванне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый — фактар эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі, накіраванай на вырашэнне жыццезабеспячэння насельніцтва».**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Падчас пасяджэння будзе абмеркавана работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання Чачэрскага раёна па забеспячэнні ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця падведамаснай тэрыторыі, выкарыстанні рэсурснага патэнцыялу рэгіёнаў у мэтах выканання даручэння кіраўніка дзяржавы аб удзеянні ВУП, а таксама пойдзе гаворка пра ўзровень і якасць жыцця грамадзян.

У рамках мерапрыемства члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні правядуць асабістыя прыёмы грамадзян і юрыдычных асоб ва ўсіх сельсаветах раёна, сустрэнуцца з актывам органаў мясцовага самакіравання, абмяркуюць стан і перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, пытанні фарміравання даходнай базы мясцовых бюджэтаў і зніжэння ўзроўню іх датацыйнасці, занятасці і стварэння новых вытворчасцяў і рабочых месцаў, забеспячэння жыллёва-камунальнымі паслугамі насельніцтва, а таксама павышэння якасці работы з людзьмі.

Завершыцца мерапрыемства дабрачыннай акцыяй у Чачэрскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе.

## Ёсць чым пахваліцца і што абмеркаваць

МЭТЫ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ

*24 студзеня ў Мінску адбудзецца першы Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці*

**У Форуме прымуць удзел прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў, эканомікі, працы і сацыяльнай абароны, энергетыкі, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, Нацыянальнай акадэміі навук, Парка высокіх тэхналогій, прамысловых прадпрыемстваў, вядучых ВНУ, а таксама грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. Акрамя таго, удзельнікамі мерапрыемства стануць прадстаўнікі агенцтваў ААН і міжнародныя эксперты. Усяго форум збярэ каля 400 чалавек.**

На форуме будзе прадстаўлены нацыянальны вопыт Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Панэльныя дыскусіі пройдуць па некалькіх тэматычных кірунках: устойлівы эканамічны рост як умова забеспячэння высокага ўзроўню жыцця беларускага народа; забеспячэнне экалагічнай бяспекі, захаванне і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; паляпшэнне якасці жыцця праз здароўе, запатрабаваную адукацыю, годную працу.

Удзельнікі абмяркуюць магчымасці больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу ўзаемадзеяння грамадства, бізнесу і ўлады для ўстойлівага развіцця, ролю прадпрымальніцтва ва ўстойлівым развіцці рэгіёнаў, перспектывы глабальнага партнёрства ў мэтах устойлівага развіцця. Размова пойдзе аб мерах па барацьбе са змяненнем клімату, рацыянальным выкарыстанні водных рэсурсаў, эфектыўнай занятасці, пашырэнні правоў людзей з абмежаванымі магчымасцямі, гендарнай роўнасці і іншым.

Асаблівая ўвага будзе аддадзена пытанням лічбавізацыі як драйвера эканамічнага росту. Асобна абмяркуюць трансфармацыю энергетычнай сістэмы ў мэтах устойлівага развіцця. Будзе прадстаўлена нацыянальная платформа справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця і паказчыкі МУР. Адбудзецца таксама прэзентацыя праекта «Садзейнічанне Рэспубліцы Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця».

# НАПОЛНИТЬ РАБОТУ ПРАКТИЧЕСКИМ СМЫСЛОМ

**Создание ассоциаций местных Советов депутатов должно дать новый импульс развитию регионов, улучшить активность населения в решении задач местного значения. Об этом говорилось на совещании по вопросам совершенствования местного самоуправления, которое состоялось в Совете Республики под руководством председателя Постоянной комиссии по региональной политике и местному самоуправлению Александра Попкова.**



Семинар по вопросам развития ассоциации местных Советов депутатов. 11 декабря 2018 года.

Практика создания ассоциаций органов местного самоуправления широко распространена во многих зарубежных странах. Швеция, Дания, Болгария, Финляндия имеют богатый опыт работы таких добровольных негосударственных объединений с правом юридического лица и возможностью решать многочисленные проблемы регионального уровня: от связи с парламентом и правительством до отдельных вопросов жизнеобеспечения населения. Представители этих стран уже делились европейским опытом работы ассоциаций органов местного самоуправления с белорусскими коллегами. Достаточно вспомнить прошлогодние мероприятия — круглый стол по местному самоуправлению и семинар по вопросам развития ассоциаций с участием Конгресса местных и региональных властей Совета Европы, которые были организованы Советом Республики.

В Беларуси опыт создания ассоциаций местных Советов депутатов носит пока еще единичный характер, хотя законом «О местном управлении и самоуправлении» закреплена возможность организации их деятельности на территории нашей страны.

По мнению председателя Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александра Попкова, создание ассоциаций местных Советов депутатов необходимо продолжить во всех областях, но их работа должна быть наполнена практическим смыслом, обеспечивать интересы своей территории. «Мы должны чувствовать все болевые точки конкретного региона и создавать ассоциации по решению проблем, волнующих население. Наша задача — подключить общественность к активному участию в жизни своего населенного пункта и вместе решать все наболевшие вопросы».

Государство определило задачи в области экономики, по улучшению жизни граждан, предусмотрело меры для развития малого бизнеса. Практическая реализация многих из этих вопросов должна лечь в основу деятельности созданных ассоциаций.

Ассоциация может стать площадкой, где получат развитие различные формы социально-экономического сотрудничества в области экологии, регулирования рынка потребительских товаров, социального обслуживания населения, оказания образовательных услуг.

Кроме того, с созданием ассоциаций появится возможность для обмена опытом и лучшими практиками в работе местных органов власти, депутатского корпуса, повышения квалификации служащих органов местного самоуправления.

Необходимость совершенствования действующей системы самоуправления в нашей стране подтверждают и социологические опросы. По мнению населения большинства регионов, изученного Институтом социологии НАН Беларуси в 2018 году, эту идею одобрили 73,5 % минчан. Среди населения Брестской, Минской, Гродненской, Витебской и Гомельской областей доля поддерживающих необходимость совершенствования работы органов местного самоуправления составила 66,4 %, 60,2 %, 55,1 %, 54,8 % и 43,5 % соответственно (большинство населения Могилевской области — 60 % жителей региона — затруднилось с выбором ответа на данный вопрос).

Постоянная комиссия Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению одобрила план мероприятий по развитию ассоциаций местных Советов депутатов в Республике Беларусь, рассмотренный в рамках работы Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики.

Планируется, что уже в апреле должны состояться Международная научно-практическая конференция на тему «Местное самоуправление. Современные этапы развития» и заседание Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики по вопросу развития ассоциаций местных Советов депутатов.

**Наталья БИТЕЛЬ.**

# ЦЯПЕР НЕ ДА ГАДЖЭТАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**



У віртуальнай прасторы каток таксама аб'яднаў прыхільнікаў здаровага ладу жыцця. Цяпер 250 чалавек у групе «Шведская горка. Наша будучыня» аднаго з распаўсюджаных месенджараў не толькі хваляцца сваімі фізкультурнымі дасягненнямі, а і абмяркоўваюць, якім чынам праект, што ўзнік з прыватнай ініцыятывы, можа развівацца далей.

Перш чым дзеці сталі апранацца ў сапраўдную хакейную амуніцыю, дарослыя падрыхтавалі для гэтага глебу. Прычым у літаральным сэнсе. Грунт выраўнялі, зрабілі «апалубку», выслалі падкладку. Яшчэ ў канцы лістапада адзін з жыхароў дома — Андрэй Анашкін паспрабаваў заліць каток на месцы, дзе летам была баскетбольная пляцоўка: проста са шланга з акна сваёй кватэры. З іншага боку да справы далучыўся Антон Піскуноў.

— Узгадніў ініцыятыву ў РЭУ-2. Там нам пайшлі насустрач, усё растлумачылі і накіравалі ў «Водаканал», каб скласці адпаведны дагавор на выкарыстанне вады і забяспечыць доступ да пажарнага гідранта, — тлумачыць ён. — Каля 200 рублёў пайшло на абсталяванне пляцоўкі: гэта дошкі для борцікаў, падкладка-цырата, самарэзы... За ваду за першы месяц заплацілі 27 рублёў. Але яе мы пастаянна падліваем, таму расходы яшчэ будуць.

Дваровая лядовая арэна сёння мае плошчу 375 квадратных метраў. На ёй — пяцісантыметровы пласт лёду. Яго залівалі паступова — на працягу пяці дзён. Папярэдне ўтрамбавалі снег, па перыметры замацавалі адбартоўку. Цяпер раяць іншым: ідэальная тэмпература для залівання — мінус дзесяць градусаў.

Кожны вечар каток чысцяць. Заклік у месенджары — і адразу ж некалькі мужчын са старэйшымі сынамі выходзяць добраўпарадкоўваць пляцоўку. У выпадку, калі лёд пачынае падтаваць, ваду падліваюць. Цяпер гавораць: спачатку такім чынам праста пазнаёміліся з новымі суседзямі, а потым і сяброў сярод іх знайшлі. Агульная справа аб'ядноўвае. Дарэчы, падчас адкрыцця катка многія бацькі пераапрануліся ў казачных герояў і дапамаглі арганізаваць свята з конкурсамі і эстафетамі. Цяпер ва ўсіх адно жаданне — каб пачынанне развівалася.

— Мы зараз супольна абмяркоўваем, як далей прывадзіць свой двор у парадак, — гаворыць Кацярына Піскунова. — Хочам, каб нам у гэтай справе дапамагалі жыллёва-камунальныя службы. Трэба азеляняць наш мікрараён. Зусім побач знаходзіцца рака Сож, а да яе няма добраўпарадкаванага спуску. Таксама марым арганізаваць пляцоўку для дзяцей — ідэй шмат.

Між тым лядовыя пляцоўкі — лепш ці горш абсталяваныя — некалі заліваліся ў кожным школьным двары. Пра гэта з настальгіяй успамінаюць дзядулі тых школьнікаў, якія сёння так радуюцца дваровай арэне ў гомельскім мікрараёне Шведская горка. Так, на коўзанках і каленкі разбіваліся, і твары. Але ж на іх гартаваліся і характары юных спартсменаў, якія потым абаранялі гонар вялікай краіны.

Сёння ж часам лягчэй адмовіцца ад ідэі, чым знайсці магчымасць увасобіць яе ў жыццё. «А што, так можна было? І ніхто не забараніў? А тэхніка бяспекі выконваецца?», — пытаюцца ў мяне многія са шчырым здзіўленнем. Напэўна, тыя ж людзі потым будуць здзіўляцца, што іх нашчадкі не ведаюць, як жыць у сапраўдным, а не віртуальным жыцці, як браць на сябе адказнасць, як прымаць рашэнні і як рабіць нешта карыснае для сваякоў, суседзяў, сяброў... Для краіны ўрэшце.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

СВОЙ ДОСВЕД

# АГРАСЯДЗІБЫ БЕЛАРУСІ ВЕДАЮЦЬ НАВАТ У АФРЫЦЫ

## Балельшчыкі ІІ Еўрапейскіх гульняў ужо рэзервуюць вясковыя гатэлі

**«Адышоў час, калі гасцям патрэбныя былі толькі «чарка і скварка», ім ужо цікавыя музеі, культурная праграма», — лічыць гаспадар аграсядзібы «Ганка» Анатоль Ганец. Аб тым, як развіваецца сельскі турызм, у прэс-цэнтры БелТА падзяліліся меркаваннем эксперты ў гэтай галіне.**

### ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

Упершыню пра аграсядзібы ў нашай краіне загаварылі ў 2002 годзе. У 2006-м былі вядомыя 34 аб'екты, якія пазіцыянавалі сябе як аграсядзібы, у 2010-м — 884. Па словах **намесніка дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталя ГРЫЦЭВІЧА**, на 1 студзеня ў нашай краіне налічваецца 2319 суб'ектаў агратурызму, у тым ліку на базе сельскагаспадарчых арганізацый — 20. Між тым рэальна ажыццяўляе сваю дзейнасць толькі 1821 сядзіба. На думку Віталя Грыцэвіча, рынак насыціўся — пра гэта сведчыць з'яўленне нязначнай колькасці новых сядзіб. У 2017 годзе іх колькасць вырасла на 1,8 %. Пры гэтым гасцей прымаецца больш. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя павелічэння колькасці замежных турыстаў не толькі з Расіі, краін СНД, але і з Еўрасаюза, Паўночнай Амерыкі. Нават на афрыканскім кантыненце ведаюць Беларусь — у сядзібах пабывалі госці з Гвінеі і Габона. У цэлым доля замежных турыстаў у 2017 годзе вырасла на 9 %. Сур'ёзны штуршок для развіцця агараэкатурызму даў «бязвіз».

> Кожная сядзіба павінна мець бізнес-план. Цяпер перад гэтай галіной сельскага бізнесу стаіць задача перайсці ад колькасці да якасці.

Сёлета, лічыць чыноўнік, ёсць выдатная магчымасць «скарыстацца момантам» правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў. Акрамя 18 тысяч удзельнікаў спартыўных каманд ў іншых афіцыйна акрэдытаваных асоб, чакаецца прыезд прыкладна 30 тысяч балельшчыкаў. Дарэчы, яны ўжо бранiруюць месцы ў сядзібах. «Гэта выдатны шанц паказаць замежнікам Беларусь ва ўсёй яе разнастайнасці, — сказаў прадстаўнік Мінспорту. — Запланаваны злёт караванераў, праведзенне дня адчыненых дзвярэй у аграсядзібах».

На думку Віталя Грыцэвіча, сельскі турызм стаў нашай адметнай цікавінкай у 2016 і 2018 гадах, калі краіна заняла першае месца ў намінацыі «Аграэкатурызм» у рэйтынгу National Geographic Traveler Awards сярод найлепшых турыстычных дэстынацый.

### БІЗНЕС АБО ХОБІ?

**Каб атрымаць статус гаспадара аграсядзібы і пачаць прымаць турыстаў, дастаткова ўсяго толькі зарэгістравацца ў сельвыканкаме. Стаўка падатку — адна базавая велічыня на год.**


hatka.by

Смачныя пачастункі.

Уладкоўвае сядзібы кожны па свайму разуменні: ад рэканструкцыі старога дома да будаўніцтва шыкоўнага катэджа. Крэдытнай падтрымкай ААТ «Белаграпрамбанк» скарыстаўся 591 суб'ект агратурызму (на суму 6,45 млн рублёў).

Першапачатковая ідэя аграсядзіб — адпачынак у вёсцы, вяртанне да вытокаў. Аднак з развіццём гэтага сектара многія аграсядзібы пачалі спецыялізавацца на правядзенні вяселляў і карпаратываў. Тады і было ўзнята пытанне аб тым, што адна базавая велічыня за такую дзейнасць — несур'ёзна. Абмяркоўваліся розныя варыянты, у выніку прыйшлі да высновы, што льготы для ўладальнікаў аграсядзіб, замацаваныя Указам № 372 (дзейнічае да 2021 года), павінны застацца ў сяле. А каб расставіць усе кропкі над «і», Прэзідэнт Беларусі падпісаў Указ № 365 «Аб развіцці аграэкатурызму», які ўступіў у сілу з 12 снежня 2018 года.

Дакументам прадугледжана, што, каб займацца агратурызмам, па-ранейшаму не трэба рэгістраваць ІП ці юрыдычную асобу. Спрасціліся і пытанні выкарыстання дамоў і зямельных участкаў. Таксама дадзены вычарпальны пералік паслуг, якія могуць аказваць сядзібы. Сярод іх і праведзенне прэзентацый, юбілеяў, банкетаў; аказанне паслуг лазняў, саўн і душавых; катанне на жывёлах, за выключэннем дзікіх, і конны транспарт; даванне інвентару для спорту і адпачынку; транспартнае абслугоўванне аграэкатурыстаў.

На думку Віталя Грыцэвіча, калі ў сядзібе праводзяць выключна вяселлі і карпаратывы, то гэта псеўдаагратурызм. А **старшыня БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА** сцвярджае, што «вялікія сядзібы без масавых мерапрыемстваў існаваць не змогуць». Да таго ж бізнес носіць сезонны характар, а некаторыя сядзібы і зусім працуюць ад выпадку да выпадку, і змяненне стаўкі падатку было б для іх вялікім цяжарам.

Прадстаўнік Мінспорту прызнаўся, што летась яму прыходзілася часцей за ўсё разглядаць звароты аб тым, як правільна будаваць гасцявыя домікі, а таксама скаргі суседзяў на шум у сядзібах падчас правядзення тых самых вяселляў і карпаратываў. Таксама ён адзначыў, што аграэкасядзібам трэба больш цесна супрацоўнічаць з тураператарамі: «Пакуль жа ў нас не рэдкасць сітуацыі, калі тураператар дамаўляецца аб прыёме групы, напрыклад, 40 турыстаў з Германіі, а потым перапэлефаноўвае гаспадар і ўсё адмяняе, таму што на гэты ж дзень яму прапанавалі правядзенне вяселля».


delinform.ru

«Ганка» прымае гасцей.

Свой погляд на гэтую праблему выказаў **старшыня грамадскага савета па развіцці аграэкатурызму Валожынскага раёна, уладальнік аграсядзібы «Ганка» Анатоль ГАНЕЦ**: «Была спроба працаваць з тураператарамі, але яны хочуць даволі вялікі працэнт за свае паслугі. Таму заказчыкі падлічваюць, наколькі ім гэта выгадна».

Дарэчы, суткі пражывання ў сядзібе каштуюць ад 15 рублёў і амаль што... да бясконцасці. Многія гаспадары аддаюць перавагу не запытам індывідуальных турыстаў, а кампаніям.

### КОЛЬКІ «ЭКА» Ў СЕЛЬСКІМ ТУРЫЗМЕ?

Па словах Валерыі Кліцуновай, госці сядзіб усё больш патрабуюць арганічнай ежы, а гаспадары актыўна выкарыстоўваюць тэхналогіі, звязаныя з энергіяй сонца і ветру. Наладжана супрацоўніцтва з заказнікамі. «У іх няма інфраструктуры, але ёсць спецыялісты, — тлумачыць Валерыя Кліцунова. — Людзям зручна жыць у аграсядзібе і наведваць заказнікі ў суправаджэнні персаналу». Гэта разумны падыход, бо супрацоўнікі заказнікаў вучаць турыстаў правільным паводзінам на ўнікальных прыродных аб'ектах, робяць іх даступнымі для ўсіх людзей. У прыватнасці, у Налібоцкай пушчы прагулкі па экасцяжынцы могуць здзяйсняць людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

Фермерская кветкавая гаспадарка «Экафлора» праводзіць экскурсіі і квэст, у пачатку якога госці саджаюць у імянны гаршчок маленькую кветачку, а пасля завяршэння мерапрыемства атрымліваюць падросшую. Валерыя Кліцунова з захапленнем распавядала, што, аказваецца, не ўсе разумеюць гэты просты трук і многія цікавяцца, як жа кветка здолела вырасці за пару гадзін? Гэта яна называе «эканомікай уражанняў».

«Белавежская пушча не паспявае абслугоўваць групы замежных турыстаў, якія прыязджаюць да нас слухаць спевы птушак, — кажа Віталь Грыцэвіч. — На дапамогу Нацпарку прыходзяць гаспадары аграэкасядзіб, якія таксама ведаюць месцы дыслакацыі лясных спевакоў». Валерыя Кліцунова адзначае, што агараэкатурызм — удалы прыклад прыватна-дзяржаўнага партнёрства: БГА «Адпачынак у вёсцы» цесна супрацоўнічае з Мінспортy.

### ВАЛОЖЫНСКАЯ ТАЛАКА

Анатоль Ганец расказаў, што свой кластар яны стварылі дзесяць гадоў таму. Саму ідэю ён прывёз з Ізраіля, дзе некаторы час жыў. Валожынскі кластар пачынаўся з 8 сядзіб, цяпер іх 52. Сутнасць кластара ў тым, што гаспадары сядзіб аб'ядноўваюць намаганні ў складанні праграмы адпачынку для гасцей. «Навошта мне трымаць каня, калі побач ёсць сядзіба, дзе гэтым займаюцца прафесійна, яшчэ адзін сусед — пчаляр, трэці — рамеснік», — разважае ён. Госці кожнага гаспадара наведваюць некалькі сядзіб.

> У нас не рэдкасць сітуацыі, калі тураператар дамаўляецца аб прыёме групы, напрыклад, 40 турыстаў з Германіі, а потым перапэлефаноўвае гаспадар і ўсё адмяняе.

— У нас распрацаваны веламаршрут, а таксама ёсць умовы для прыёму гасцей, якія перасоўваюцца на калясках, — кажа Анатоль Ганец.

У рэгіёне створаны спажывецкі кааператыў «Валожынскія гасцінцы», куды ўвайшлі гаспадары сядзіб і мясцовыя фермеры. Аб'яднанне адпраўляе ў сталіцу сваю прадукцыю: хлеб, малако, мяса. Прычым выпечка хлеба — спецыялізацыя «Ганкі». На думку Анатоля Ганца, кожная сядзіба павінна мець бізнес-план. Цяпер перад гэтай галіной сельскага бізнесу стаіць задача перайсці ад колькасці да якасці.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**


hatka.by

Забаўляльная праграма.

КОНКУРС

# Хто найлепшы?

## У Пінскім раёне будуць праводзіць конкурс сярод сельсаветаў і старастаў

**РАШЭННЕМ райсавета дэпутатаў на мінулай сесіі зацвердзілі адпаведную інструкцыю. Згодна з ёй, арганізатары конкурсу будуць штогод вызначаць найлепшы сельсавет і старасту па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.**

Конкурс заснаваны дзеля таго, каб павысіць ролю сельскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага кіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння людзей, сацыяльна-эканамічным развіцці адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, актывізацыі работы па заахвочванні насельніцтва ў вырашэнні пытанняў, якія маюць мясцовае грамадскае значэнне. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца ўсе сельсаветы і старасты Піншчыны. Вынікі будуць падводзіць штогод да 10 лютага года, які ідзе за справаздачным.

Якія будуць крытэрыі для вызначэння пераможцаў?

Згодна з зацверджанай інструкцыяй, па сельскіх Саветах у залік будуцьісці такія фактары, як выкананне мерапрыемстваў у межах дзяржаўных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, камунальна-бытавога і сацыяльна-культурнага абслугоўвання насельніцтва на адпаведнай тэрыторыі, выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў, інфармацыйнае забеспячэнне насельніцтва па месцы жыхарства, добраўпарадкаванне населеных пунктаў і аб'ектаў вытворчага і сацыяльна-бытавога прызначэння, уключэнне ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўваемых зямельных участкаў. Акрамя таго, важкае значэнне будзе мець дэмаграфічнае становішча, стварэнне рабочых месцаў, прафілактыка злачынстваў і правапарушэнняў, прыцягненне насельніцтва да аховы грамадскага правапарадку, развіццё культурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай работы і іншыя фактары.

Што датычыцца вызначэння найлепшых старастаў у раёне, то крытэрыямі ацэнкі іх работы будуць развіццё грамадскага руху па добраўпарадкаванні і падтрыманні ў чысціні населеных пунктаў, вуліц, дамоў, двароў, пад'ездаў, арганізацыя работы па забеспячэнні паўнаты і своечасовасці аплаты насельніцтвам жыллёва-камунальных паслуг, удзел у разглядзе зваротаў грамадзян, прыцягненне насельніцтва да аховы грамадскага парадку. Між іншым, пры падвядзенні вынікаў будзе прымацца ў разлік і выхаваўчая работа з дзецьмі і падлеткамі па месцы жыхарства, арганізацыя культурных мерапрыемстваў, свят вёскі, і ўдзел у прапагандзе здаровага ладу жыцця, і іншыя крытэрыі.

Падводзіць вынікі конкурсу будуць па пяцібальнай сістэме, ацэньваць крытэрыі — у залежнасці ад выканання кожнага з іх па найбольшай колькасці набраных балаў.

Найлепшы сельсавет у раёне атрымае за перамогу 40 базавых велічынь, староста — 5 базавых. Дарэчы, сярод старастаў вызначаць не толькі пераможцу, але і прызёраў: за другое месца гарантавана 4 базавыя, за трэцяе — 3 базавыя велічыні.

Узнагароджванне прадугледжана ва ўрачыстай абстаноўцы адпаведнымі дыпломамі, якія найлепшым сельсаветам і старастам уручыць старшыня мясцовага райсавета дэпутатаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# НА КІМ ВЁСКА ТРЫМАЕЦЦА

*(Заканчэнне.* *Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Каб не закрылі пошту, давялося напісаць калектыўны ліст. І Васілеўна, як яе з павагай называюць землякі, паехала ў Віцебск — да начальства ў аблвыканкам. Зварот зарэгістравалі, разабраліся ў пытанні і пайшлі насустрач вяскоўцам.

Старэйшына канстатавала, што прыкладна палова адаменцаў — пенсіянеры. І некаторыя адзінока пражываючыя патрабуюць проста ўвагі да сябе.

— Бывае, тэлефануюць і просяць зайсці, нешта цікавае расказаць, пагутарыць, — распавядае яна. І смяецца майму жарту, што такім чынам выступае ў ролі псіхатэрапеўта. А, калі задумацца, так яно і ёсць, бо адзінота ў старасці — бяда, якая бывае цяжэйшая, чым хвароба.

Сама старэйшына — працуючая пенсіянерка. Наводзіць парадак у лёзненскім доме рамёстваў. Там, дарэчы, яна займаецца і ў народным фальклорным ансамблі «Медуніца». Спяваюць так добра, што аж двойчы былі запрошаны выступіць у Латвію. Калектыў — пастаянны ўдзельнік «Дажынак» і ўжо стаў «зорным» дзякуючы вулічным канцэртам на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Жанчына з гонарам дадае, што і ў Мінску выступалі некалькі разоў.



Старэйшына вёскі Адаменкі Валянціна Васілеўна ЗАМАСТОЦКАЯ (злева) і старшыня Лёзненскага сельвыканкама Святлана ПУКАВА.

— Частушкі таксама спяваем, і слухачам гэта вельмі падабаецца, — усміхаецца яна. Зразумеў, што ў тым ліку і вясёлы нораў дапамагае Валянціне Васілеўне знаходзіць агульную мову з людзьмі. А артыстычныя здольнасці — арганізоўваць і ўдзельнічаць у святах.

А яшчэ яна — траўніца, вырошчвае кветкі...

Абаяльная і ўсмешлівая жанчына становіцца вельмі сур'ёзнай, калі наведвае тых, хто, скажам так, сумлення жыцця не хоча.

— Я веру, што чалавека ніколі нельга лічыць страчаным для грамадства. Вось, напрыклад, у вёсцы чатыры сям'і знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Я стараюся перыядычна кантраляваць, чым яны займаюцца, а дэпутат сельскага Савета Людміла Паўлоўская, якая ў мясцовай гаспадарцы працуе загадчыцай склада, у гэтай і іншых справах — напарніца, — кажа старэйшына.

Жанчыны агітуюць займацца добраўпарадкаваннем. І ёсць выпадкі, калі вяскоўцы добраахвотна ўпрыгожваюць не толькі ўласныя падворкі. Напрыклад, сусед старэйшыны змайстраваў вулічныя арэлі на радасць дзятве. Старэйшына агітуе народ здаваць грошы і на так званае самаабкладанне. Летась скінуліся па тры рублі — лямпы вулічныя купілі...

Цяпер Валянціна Васілеўна змагаецца, каб абласная арганізацыя «Водаканал» адрамантавала вулічную каналізацыю. Яшчэ трэба, каб дарожнае пакрыццё было зручным для аўтамабілістаў і пешаходаў, каб вуліцы чысцілі ад снегу своечасова. Ды і шмат іншых інтарэсаў у народнага выбранніка — старэйшыны.

Паводле слоў старшыні Лёзненскага сельвыканкама Святланы Пукавай, сярод старэйшын не бывае выпадковых людзей. Калі на гэтай адказнай «пасадзе» аказацца чалавек раўнадушны, малаініцыятыўны, якога не прымусіш быць актывістам, дык самі людзі гэта заўважаюць у першую чаргу. А на «сельскіх мэраў», якія ведаюць усё пра «сваіх», якія насамрэч бліжэй за ўсіх да вяскоўцаў, заўсёды можна палажыцца. І, перафразуючы выказванне пра людзей, на якіх зямля трымаецца, можна сказаць, што вёскі — на старэйшынах. Яны — моцнае звяно паміж мясцовай уладай і грамадзянамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

КЛОПАТ І РАЗУМЕННЕ

# ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ — АКТЫЎНАЯ

**Віцебшчына была першай вобласцю, дзе распрацавалі палажэнне аб дзейнасці старэйшын, ды яшчэ з прэміраваннем. Адпаведныя дакументы былі падпісаны ў лістападзе 2005 года. Дарэчы, губернатарам вобласці тады быў цяперашні старшыня Палаты прадстаўнікоў парламента Уладзімір Андрэйчанка. А старшынёй аблсавета — Аляксандр Ацяскаў.**



Што датычыцца фінансавага заахвочвання старэйшын, — яно сімвалічнае. Ды і тое толькі па выніках работы за квартал. Выплаты залежаць ад колькасці двароў населенага пункта (або некалькіх): да 20 двароў — базавая велічыня; да 50 двароў — 1,5 базавай; да 100 двароў — 2 базавыя велічыні; звыш 100 двароў — 2,5.

Матэрыяльнае стымуляванне найбольш актыўных старэйшын ажыццяўляецца са сродкаў мясцовых бюджэтаў. Пры гэтым, як кажуць у арміі, фронт работ вельмі шырокі.

**У Віцебскай вобласці каля 6260 населеных пунктаў. І прыблізна 45 % — з колькасцю насельніцтва да 10 чалавек. Дарэчы, выступаючы на V Усебеларускім народным сходзе, Уладзімір Цярэнцьеў адзначыў, што трэба прыняць новую праграму адраджэння і развіцця вёскі. Падкрэсліў, што нельга дапусціць, каб невялічкія вёсачкі зніклі з карты Беларусі. І канешне, старэйшыны могуць падказаць уладзе, што трэба зрабіць, каб кожны грамадзянін, незалежна ад месца пражывання, адчуваў клопат, падтрымку, разуменне праблем. Менавіта старэйшыны, упэўнены Уладзімір Цярэнцьеў, заўсёды ў курсе ўсяго, што адбываецца ў населеных пунктах.**

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** *(на фота)* канстатуе, што старэйшыны населеных пунктаў — сапраўды злучальнае звяно паміж насельніцтвам і органамі прадстаўнічай і выканаўчай улады.

— Ад эфектыўнасці іх працы шмат у чым залежыць вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Яны — надзейныя памочнікі ў вырашэнні надзённых задач мясцовай улады.

З дапамогай старэйшын населеных пунктаў, неабыякавых людзей з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй Саветам дэпутатаў значна лягчэй выяўляць і вырашаць праблемы грамадзян, маючых патрэбу ва ўвазе і падтрымцы. І ў першую чаргу ветэранаў вайны, інвалідаў, пажылых людзей, — упэўнены Уладзімір Цярэнцьеў.

Старэйшыны аказваюць досыць адчувальную дапамогу сельвыканкамам у аператыўным вырашэнні праблем, якія патрабуюць неабходнага ўмяшання з боку мясцовай улады. «Сельскія мэры» — члены саветаў грамадскіх пунктаў аховы правапарадку, назіральных камісій і гэтак далей.

Па прыклады актыўных старэйшын далёка хадзіць не трэба. Так, дзякуючы ініцыятыве старэйшын населеных пунктаў Браслаўскага раёна Аліны Станіславаўны Маслоўскай, Ванды Мечыславаўны Магрын, Генрыха Іванавіча Вавінскага, Саламеі Антонаўны Мацулевіч, Мікалая Міхайлавіча Петухова добраўпарадкавана тэрыторыя каля банкамата ў аграгарадку Ахрэмаўцы, зрэзаны аварыйныя дрэвы і заменена агароджа на могілках у вёсцы Дзегцяры, выдалена дрэва-хмызняковая расліннасць уздоўж дарогі Крукі — Мякяны. Сабралі грошы для закупкі адрасных указальнікаў на дамы, арганізавалі агароджу могілак у вёсцы Майшулі, правялі работы па абсталяванні дзіцячай тэматычнай гульнявой пляцоўкі і грамадскага месца адпачынку ў аграгарадку Опсаі... Зроблена і многае іншае.

Пры непасрэдным удзеле старэйшын населеных пунктаў Докшыцкага раёна Таццяны Рыгораўны Сыс, Леакадзіі Баляславаўны Маслоўскай, Таісіі Яўгенаўны Несцяронак арганізавана збор сродкаў на ўстаноўку металічнай агароджы і брамы для могілак у вёсцы Дзедзіна. Устаноўлена агароджа, выдалены старыя дрэвы на могілках у вёсцы Грынеўшчына, добраўпарадкаваны могілкі ў вёсцы Станіслаўцы.

— А дзякуючы актыўнай жыццёвай пазіцыі старэйшын населеных пунктаў Шумілінскага раёна Марыі Цімафееўны Лялюгі, Алы Мікалаеўны Бубен, Матроны Уладзіміраўны Гушчы, Валянціны Сяргееўны Храмцовай, Святланы Пятроўны Зуевай добраўпарадкавана вёска Дабея аднайменнага сельсавета і напісалі гісторыю гэтага населенага пункта. А 25 чэрвеня 2016 года адкрылі памятны знак і мемарыяльную дошку ў гонар 610-годдзя першага згадвання пра вёску, — працягвае старшыня абласнога Савета.

Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле старэйшыны аграгарадка Пальмінка Гарадоцкага раёна Валянціны Уладзіміраўны Гаруновай добраўпарадкавана вуліца Школьная, зроблены рамонт пад'ездаў у двух жылых дамах. Прыбраны несанкцыянаваныя звалкі і абноўлена агароджа на грамадзянскіх могілках. Што яшчэ цікава: узяты пад асабісты патранаж пяць сем'яў адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## панядзелак, 21 студзеня



### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Усход — Захад» (16+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Вернешся — пагаворым» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Нашы (6+).
**22.05 Серыял «След» (16+).**
**23.45** Арэна.
**0.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+).
**9.00, 18.40** Тэлебарометр.
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**10.05** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.40** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**11.15 М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды» (12+).**
**12.25 М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).**
**13.10** Анімацыйны фільм «Горад герояў» (0+).
**14.50 Камедыя «Рэд-2» (12+).**
**16.40 Меладрама «Ціхая гавань» (12+).**
**19.15** Суперлато.
**21.10, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** КЕНО.
**23.00** «Хадзі сюды і танцуй».
**23.05 Серыял «Самара» (16+).**
**23.55** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Кашанка.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 12.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 18.00 «Здаецца кватэра з дзіцем». Маст. фільм (6+).**
**10.40** «Навукаманія» (6+).
**11.10** «Майстры і куміры». Паэт, мастак Сяргей Давідовіч.
**12.25** «Люблю і памятаю». Заслужаны артыст БССР Эдзі Рознер.
**13.10, 21.45 «Вызваленне». Маст. фільм «Вогненная дуга» (12+).**
**14.30, 21.05** «Апошні дзень». Усевалад Санаеў (12+).
**15.10** «Беларуская кухня». Дзічына, тушаная з грыбамі і гароднінай.
**15.40** «Наперад у мінулае».
**16.10** Юбілейны канцэрт Аляксандра Дабранравава.
**19.20** «Выдатныя авіяканструктары». Алег Антонаў (12+).
**20.00** «На прыродзе з Віталём Гуменным». Балота Дзікое.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Тэатр у дэталях». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Анюта».

### Беларусь 5

**7.10** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» — «Цмокі-Мінск».
**8.50** Вынікі тыдня.
**9.30** Фрыстайл. Лыжная акрабатыка. Этап Кубка свету. Лэйк-Плэсід.
**11.05** Вялікі спорт.
**11.50, 13.25** Спорт-мікс.
**12.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Мас-старт. Мужчыны.
**12.55** Гульні «навырост».
**13.35** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Зеніт» — ЦСКА.
**15.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Хадэрсфілд» — «Манчэстэр Сіці».
**17.20** Хакей для ўсіх.
**17.50** Легенды сусветнага спорту.
**18.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Рупольдынг. Мас-старт. Жанчыны.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад). (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.45** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**09.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здорава!» (16+).
**11.10 Серыял «Дэтэктывы» (16+).**
**11.50** «Модны прыгавор» (12+).
**13.10 Серыял «Грошы» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «Султан майго сэрца» (16+).**
**23.00 Да 75-годдзя поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. Маст. фільм «Блакада». «Лужскі рубеж» (16+).**
**1.00** «Нашы навіны». Галоўнае за дзень.

### СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**9.25** «Тыдзень».
**10.40, 23.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**12.25** «У апошні момант» (16+).
**12.35, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.50** «Жывая тэма» (16+).
**14.30, 16.50 «Адваротны бок Месяца». Серыял (16+).**
**19.55, 23.00** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30 «Знахар». Серыял (16+)**
**22.10** «Глядзець усім!» (16+)
**0.35** «Мінтранс» (16+).
**1.15** «Самая карысная праграма» (16+).

### МІР

**6.00, 10.10 Серыял «Ліст чакання» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.35** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.25** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.50** «Гульня ў кіно» (12+).
**17.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.20, 3.10 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**22.25, 0.10 Маст. фільм «Тата напракат» (16+).**
**5.30** «Культ/Турызм» (16+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.30 Серыял «Пыльная праца» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 20.00** Навіны — Беларусь.
**15.10** «Пернікавы домік» (12+).
**15.35** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.00** Весткі. Мясцовы час.
**17.25** «Лёс чалавека» (12+).
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Іншыя» (12+).**
**22.30, 23.10 Серыял «Тайны следства» (12+).**
**0.15** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Белавежская пушча (6+).
**6.25** Беларусы (6+).
**7.10** «Паедзем, паядзім!» (0+)
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.30** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**10.20 Серыял «Злачынства будзе раскрыта» (16+).**
**12.00** Пракурорская праверка (16+).
**13.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).**
**15.45, 16.35 Маст. фільм «Супраць усіх правілаў» (16+).**
**18.00** «ДНК» (16+).
**19.45 Серыял «Неўскі» (16+).**
**21.20 Серыял «Адзін» (16+).**
**23.10** «НЗ.by».
**23.35 Серыял «Паверх» (18+).**

### 8 канал

**7.00** — *Прафілактыка эфірнага абсталявання.*
**16.00** «Гумарынка».
**16.05** «Мультпарад» (0+).
**16.30 Серыял «Пуаро Агаты Крысці» (12+).**
**17.30 Серыял «Горш не бывае» (16+).**
**19.00, 21.05, 0.45** «Надвор'е».
**19.05 Серыял «Кандзіс Рэнуар» (16+).**
**20.00 Серыял «Арэлі» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Лінкальн для адваката» (16+).**
**23.15 Трылер «Ледзяныя дрыжыкі».**

## нядзеля, 27 студзеня



### ВТБ

**6.05** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**7.25, 3.10** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).
**8.20, 2.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.15** М/ф «ЧычыЛэнд» (0+).
**9.35** М/ф «Джынглікі» (0+).
**10.00** М/ф «Машкіны страшылкі» (0+).
**10.25** «Ералаш» (6+).
**11.00, 18.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**12.00** «Проста кухня» (16+).
**13.00** «Паспець за 24 гадзіны» (16+).
**14.00** Камедыя «Зялёны шэршань» (12+).
**16.15** Баявік «Капітал Філіпс» (16+)
**20.00** «Слава богу, ты прыйшоў!» (16+)
**21.00** Баявік «Стэлс» (16+).
**23.15** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+)
**0.40** «Хачу верыць!» (16+)
**4.00** «Лаві момант» (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30** «У гасцях у лета». «Футбольныя зоркі». «Прыходзь на каток». «Дзядзька Сцёпа — міліцыянер». М/ф.
**7.55** «Сіта і Рама». Серыял.
**10.10** «Звычайны канцэрт».
**10.40** 75 гадоў з дня поўнага вызвалення Ленінграда ад фашысцкай блакады. «Жыла-была дзяўчынка». Маст. фільм.
**11.50** «Лісты з правінцыі». Удмуртыя.
**12.20, 1.45** «Планета Зямля». Дак. серыял.
**13.15** «Сірыус», або Ліфты для «ламаносавых». Дак. фільм.
**14.00** «Маленькія сакрэты вялікіх карцін». Дак. серыял.
**14.30** Зорныя дуэты. Маст. фільм «Сансет бульвар» (16+).
**16.25** «Пешшу...» Масква падземная.
**16.55** Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту. «26 Іяра. Польшча». Дак. фільм.
**17.25** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.40** «Блізкае кола «Сазмультфільма».
**18.35** «Рамантыка раманса». Аркадзю Астроўскаму прысвячаецца...
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Блакада. Выкупленне». Дак. фільм.
**20.50** «Выпрабаванне вернасцю». Маст. фільм.
**22.45** «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Надзя Міхаэль у оперы Д. Шастаковіча «Кацярына Ізмайлава». Пастаноўка Вялікага тэатра.
**2.40** «Паляванне». «Пумс». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1990. 2-я частка. 2010 год (12+).
**7.05, 8.20, 9.45, 11.00, 13.05, 14.45, 17.05, 22.45, 1.05, 2.30, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 1.30** Маст. фільм «Прафесія — следчы» (16+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Выпадковая сустрэча» (12+).
**13.30** «Гэты фантастычны свет». «Псіхадынаміка вядзьмарства». 1990 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Маст. фільм «А паходы гудуць і адыходзяць» (16+).
**18.00** «Вакол смеху». «Пра анекдот». 1990 год (12+).
**19.40** «Праграма А». 1990 год (16+).
**21.40** Маст. фільм «Вялікія перагоны» (12+).
**23.00** Кінаканцэрт «Вам песня прысвячаецца, або Зноў карнавальная ноч». 1983 год (12+).
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». «Звукі Му». 2-я частка (16+).
**4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).

### EuroSport 1

**0.00, 11.15, 14.45** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**0.15, 18.45, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**1.35** Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы.
**2.45, 15.30, 20.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**3.30, 10.00** Тэніс. Australian Open. Жанчыны. Фінал.
**7.00** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Пары. Фінал.
**9.00** Тэніс. Australian Open.
**11.30, 23.00** Тэніс. Australian Open. Мужчыны. Фінал.
**15.00, 17.00, 21.00** Біятлон. Кубак свету.
**16.30** Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету.
**18.15** Санны спорт. Чэмпіянат свету.
**21.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.30** Мама дарагая! (12+).
**3.05** Мая былая сяброўка (18+).
**4.45** Забі мяне тройчы (18+).
**6.30** З 5 да 7. Час палюбоўнікаў (16+).
**8.20** Няправільныя копы (18+).
**9.55** Дзякуй за абмен (16+).
**12.05** Праект А (12+).
**14.00** Праект А: частка другая (12+).
**16.05** Што вытвараюць мужчыны! (18+).
**17.45** Што вытвараюць мужчыны!-2 (18 +).
**19.30** М + Ж (16+).
**21.00** Рымскія спатканні (16+).
**22.45** Гаспадыня «Белых начэй» (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+).
**10.50** «Глядзі сам» (12+).
**11.10, 1.55** «Выходжу цябе шукаць». Серыял (16+).
**15.10** «Жонка. Гісторыя кахання» (16+).
**16.30** «Сляды апосталаў». Серыял (12+).
**20.40** «Без падману» (16+).
**21.30** «Асцярожна, махляры!» (16+).
**22.05** «Пампы, але не цяпер». Баявік (16+).
**0.30** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**5.30** «Нераскрытыя тайны» (12+).

### ТБ1000

**6.10, 17.35** Пяты элемент (12+).
**8.45** 2 + 1 (16+).
**11.10** Восень у Нью-Ёрку (12+).
**13.20** О, дзе ж ты, брат? (16+)
**15.35** Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).
**20.10** Зялёная міля (16+).



**23.40** Нявеста, якая збегла (16+).
**2.00** Гатака (12+).
**3.50** Візантыя (16+).
**5.50** Леў (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Я буду побач (16+).
**8.15** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**10.20** Падары мне свята Месяца (12+).
**12.10** Якая цудоўная гульня (12+).
**14.05** Сабібор (12+).
**16.25** Трымай удар, дзетка! (12+)
**18.30** Абаронцы (12+)
**20.20** Уцячы, дагнаць, захацаць (12+).
**22.05** Духless-2 (16+).
**0.15** Маёр (18+).
**2.15** Увосень 41-га (12+).
**4.25** Абаронцы (12+).

### National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.20** Інжынерныя ідэі (16+).
**8.00, 4.10** Аўта-SOS (12+).
**9.30** Дзікі тунец (16+).
**11.05** Надзвычайны доктар Пол (16+).
**11.50** Інстынкт выжывання (16+).
**13.20, 17.15, 23.30** Дзённік Ганны Франк (16+).
**14.10** Загадка Халакосту (16+).
**14.55, 1.00** Адплата (16+).
**15.40, 0.15** Фашысцкі лагер смерці (16+).
**16.25** Суперзбудаванні 3-га рэйха (16+).
**18.00, 22.00** Крамянёвая даліна (16+).
**19.35** Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
**20.20** Проста магія (16+).
**1.50** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**2.35** Паранармальнае (16+).
**5.40** Навуковыя недарэчнасці (16+).

### Discovery

**8.00, 18.00** Патрабуецца зборка (12+).
**11.00** Залатая ліхаманка (16+).
**12.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**13.00, 23.00** Музейныя тайны (12+).
**14.00, 3.50** Мужчынскія бярлогі (12+).
**15.00, 2.55** Апошнія жыхары Аляскі (16+).
**16.00, 6.20** Паляўнічыя на рэліквіі (12+).
**20.00** Скрозь кратовую нару (16+).
**22.00** Будучыня з Джэймсам Вудсам (12+).
**0.00** Забытая інжынерыя (16+).
**1.00** Самагоншчыкі (18+).
**2.00** Найлепшы збройнік (16+).
**4.40** Паляўнічыя на старызну (12+).
**7.10** Мадэль для зборкі (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

## субота, 26 студзеня



### Беларусь 1

6.15 Існасць.
6.45 **Меладрама «Супрацьстаянне» (16+).**
8.25 Кулінарная дыпламатыя (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
9.10 Маршрут пабудаваны. Смілавічы (12+).
9.50 Здароўе (12+).
10.40 Гісторыі выратавання.
11.20 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
12.10 «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.40 Серыял «Сваты-3» (12+).**
13.35 «Я ведаю». Шо (6+).
15.15 Краіна.
**15.45 Меладрама «Каханне напракат» (12+).**
**17.35 Меладрама «У палоне ў хлусні» (16+).**
21.00 Панарама.
**21.45 Меладрама «Дрэнная дачка» (16+).**
1.05 Дзень спорту.

### Беларусь 2

6.55 М/с «Джынглікі» (0+).
7.05 М/с «Кунг-фу панда: захапляльныя легенды» (12+).
**8.20, 22.00** Тэлебарометр.
8.25 Анімацыйны фільм «Суперсямейка» (12+).
10.10 Хто я? (12+)
10.30 «Капейка ў капейку» (12+).
11.05 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.40 «Паненка-сялянка» (16+).
12.35 «Да пабачэння!» (16+)
**13.20 Камедыя «Нязносныя лэдзі» (16+).**
15.15 «Тата папаў» (16+).
17.20 Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка праследу. Мужчыны.
**18.15 Прыгоды «Кніга джунгляў» (12+).**
**19.55 Фантастыка «Трон: спадчына» (12+).**
22.05 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.10 Фантастыка «Трансформеры-3: цёмны бок Месяца» (12+).**

### Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
**8.00, 15.05, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 20.30** «Гэты дзень».
**8.25 «Маладая жонка». Меладрама (12+).**
10.00 «Жывая культура». Абрад «Жаніцьба Цярэшкі» (в. Вілеўшчына, Лепельскі раён, Віцебская вобласць).
10.30 «Беларуская кухня». Клёцкі па-карэліцку.
10.50 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
11.20 «Спявае Беларусь».
**12.10 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «Усходні рубеж» (12+).**
14.40 «Навукаманія» (6+).
**15.20 «Алмазы для Марыі». Дэтэктыў (12+).**
16.35 «Доказы з мінулага». Моцарт. Смяротны матыў (16+).
**17.15 «Фронт без флангаў». Маст. фільм (12+).**
20.00 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў». Камедыя (12+).**
22.40 «Вітаўт». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

### Беларусь 5

7.10 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
7.40 Фактар сілы.
8.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Спрынт. Мужчыны.
9.40 Спорт-мікс.
9.50 Трэніровачны дзень.
10.25 Вялікі спорт.
11.10 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Мінск. Мужчыны. Адвольная праграма.
15.15 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка праследу. Жанчыны.
16.15 Фігурнае катанне. Чэмпіянат Еўропы. Мінск. Танцы на лёдзе. Адвольны танец.
19.45 Хакей. КХЛ. «Слован» (Браціслава) — «Дынама» (Мінск). 2, 3-і перыяды. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.30 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Гомель» — «Юнацтва».
23.25 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка праследу. Жанчыны.
0.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Антхольц. Гонка праследу. Мужчыны.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
7.10 «Іграй, гармонік любы!» (6+)
8.00 «Фрэйндліх. Аліса ў краіне акцёраў» (12+).
9.10 «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00 Маст. фільм «Непрыгожая Любоў» (16+).**
11.45 «Жывы Высоцкі» (12+).
**12.15** «Уладзімір Высоцкі. «И, улыбаясь, мне ломали крылья» (16+).
**13.10 Камедыя «Кухарка» (0+).**
14.35 «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
16.20 Памяці Уладзіміра Мулявіна. «Песняр. Сэрцам і думамі» (6+).
17.10 «Эксклюзіў» (16+).
**18.50, 21.10** «Сёння вечарам» (16+).
20.00 «Нашы навіны». Суботні выпуск.
20.45 «Метэагід».
21.05 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
23.00 Вечар памяці Уладзіміра Высоцкага «Я, конечно, вернусь...» (6+).
0.40 «Уладзімір Высоцкі і Марына Уладзі. Апошні пацалунак» (16+).

### СТБ

6.15 «Жывая тэма» (16+).
7.55 «Анфас».
8.15 «Самая карысная праграма» (16+).
9.10 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Мінск і мінчане».
10.35 «Вялікі горад».
**11.10, 22.15** Дакументальны спецпраект (16+).
**12.10, 13.45, 16.45, 22.10 «Адваротны бок Месяца». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30, 19.30** Навіны «24 гадзіны».
20.00 «СТБ-спорт».
**0.00 «Метад». Серыял (18+).**

### МІР

6.20 «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
6.35 «Саюзнікі» (12+).
7.05 «Такія розныя» (16+).
7.35 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
8.05 М/ф (0+).
8.55 «Вой, мамачкі!» (12+)
9.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
10.15 «Як у рэстаране» (12+).
**10.45 Маст. фільм «Чапаеў» (6+).**
**12.45, 16.15, 19.15 Серыял «Страсці па Чапаю» (16+).**
**2.20 Серыял «Завушніца Казановы» (12+).**

### РТР—Беларусь

7.00 «Раніца Беларусі».
10.00 «Сто да аднаго».
11.00 Весткі.
11.25 Пяцёра на аднаго.
**12.15 Маст. фільм «Агарова, 6» (12+).**
14.00 «Наша справа» (16+).
14.15 Тайны Беларусі.
**15.10 Маст. фільм «Невалашка».**
18.30 «Запрасіце на вяселле!» (12+)
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
20.45 «Прывітанне, Андрэй!» (16+)
**22.45 Маст. фільм «Каханне па найме» (12+).**

### НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
6.40 «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.10 Серыял «Агент асобага прызначэння» (16+).**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
8.20 «НЗ.by».
8.55 «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
9.25 «Гарады Беларусі» (6+).
10.25 Галоўная дарога (16+).
11.05 «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
12.00 Кватэрнае пытанне (0+).
13.00 «НашСпажыўНагляд» (16+).
13.50 «Паедзем, паядзім!» (0+).
**14.15 Серыял «Урач» (16+).**
16.25 «Следства вялі...» (16+).
**17.20, 20.30 Серыял «Пёс» (16+).**
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.15 Серыял «Адзін» (16+).**
**0.00 Серыял «Паверх» (18+).**

### 8 канал

**7.00, 18.50, 21.15, 0.55** «Надвор'е».
7.05 М/ф «Баранчык Шон».
7.15 Дак. серыял «Малыя».
8.00 М/ф «Чароўны меч. Выратаванне Камелота».
9.25 «Утрамдзія».
**9.30 Мастацтва — кіно. Драма «Старшыня» (12+).**
**12.15 Камедыя «Дзяўчаты» (12+).**
**13.55 Камедыя «Гусарская балада» (12+).**
15.30 «Адказвайка».
15.35 Глядзім усёй сям'ёй. М/ф «Кароль сафары».
**17.00 Прыгоды «Амазонія. Інструкцыя па выжыванні» (0+).**
18.30 «Сябры дзядулі Марка».
**18.50 Трылер «Імгла» (18+).**
20.50 «Вечарніца».
21.05 «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Драма «Праклён залатой кветкі» (16+).**
**23.15 Трылер «Рыцары неба» (18+).**

## аўторак, 22 студзеня



### ВТБ

6.05 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
7.25 М/ф «ЧычыЛэнд» (0+).
7.45 М/ф «Ліга Watchcar» (6+).
8.15 М/ф «Машкіны страшылкі» (0+).
**8.45, 3.35** «Ералаш» (6+).
**9.25, 17.45** «Уральскія пельмені» (16+).
**10.20, 18.45** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**11.40, 23.35** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай» (16+).
**12.40, 20.00** Серыял «Маладзёжка-6» (16+).
**13.40, 2.45** «Рублёва — Бірулёва» (16+).
**14.40, 1.55** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
15.40 Мюзікл «Братэрства танца» (12+).
21.00 Серыял «Атэль «Элеон»-3» (16+).



22.00 Камедыя «Лаўка запасных» (12+).
0.35 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
4.00 «Лаві момант» (16+).
5.00 «Дурні і дарогі» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква манастырская.
**7.05, 20.05** «Правілы жыцця».
7.35 «Тэатральныя летапіс». Андрэй Ганчароў.
8.00 «Сіта і Рама». Серыял.
**8.50, 12.10** Сусветныя скарбы.
**9.10, 22.55** «Эйнштэйн». Серыял (16+).
10.15 «Назіральнік».
**11.10, 1.40** XX стагоддзе. «Іграем джаз!» Фестываль у Тбілісі, 1986 год.
**12.25, 18.40, 1.00** «Тым часам. Сэнсы».
13.15 «Астравы». Радзівон Нахапетаў.
**14.00, 20.45** «Цывілізацыі». Дак. серыял.
15.10 «Эрмітаж».
15.40 «Белая студыя».
16.25 «Бераг яго жыцця». Маст. фільм.
17.35 Музыка XX стагоддзя. Сэр Сайман Рэтл, Крысціян Тэцлаф і Лонданскі сімфанічны аркестр.
19.45 Галоўная роля.
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
21.45 Штучны адбор.
22.25 «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
0.05 «Імперыя балета». Дак. фільм.
2.40 Колер часу. Эдвард Мунк. «Крык».

### Настальгія

**6.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
6.55 «Навагодні лабірынт». 1985 год (12+).
7.55 «Пад знакам задыяка. Вадалей». 1993 год (12+).
9.20 Фільм-спектакль «Энергічныя людзі». 1988 год (12+).
**11.45, 12.55, 14.35, 15.45, 17.00, 18.55, 20.35, 21.45, 23.00, 1.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Уладзімір Высоцкі». 2005 год (18+).
**13.30, 19.30** Маст. фільм «Прафесія — следчы» (16+).
**15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
18.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Гульня ў хіпі». 2006 год (16+).
0.00 Маст. фільм «Настаўнік» (12+).
2.20 Канцэрт «Sixties Soft Rock». 2004 год (12+).
3.00 «Быў час». 2009 год (16+).
4.00 Маст. фільм «Іван» (16+).

### EuroSport 1

**0.30, 15.30, 20.30, 23.00** Біятлон. Кубак свету.
**1.35, 3.00, 7.00, 9.00, 11.15, 21.05** Тэніс. Australian Open.
**2.30, 14.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
11.00 Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс»-экстра.
**14.30, 19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
16.00 Снукер. «Мастэрс». Фінал.
18.00 Конны спорт. Кубак свету.
23.30 Аўтагонкі. Формула Е.

### Кінакамедыя

0.30 Каханне ў вялікім горадзе (16+).
2.10 Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).
4.00 Каханне ў вялікім горадзе-3 (16+).
5.35 Святочны перапалох (16+).
7.50 Суперсцюард (16+).
9.50 Праект А (12+).
11.45 Праект А: частка другая (12+).
13.45 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
15.30 Мая былая сяброўка (18+).
17.10 Правілы здыму: метад Хітча (12+).



19.30 Твой выхад, дзетка! (18+)
21.20 Правілы жыцця французскага хлопца (16+).
23.10 Няхай жыве Францыя! (16+)

### ТБ3

6.00 М/ф (6+).
7.10 «Школа доктара Камароўскага» (6+).
7.50 «Доктар І...» (16+).
**8.20, 19.00, 2.30** «Асколкі». Серыял (16+).
**9.35, 23.20** «Улегцы» (12+).
**10.10, 3.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**11.55, 17.40** «Варажбіт-ка» (12+).
**13.05, 16.35, 5.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
14.10 «Адкрыта» з Аксанай Байрак» (16+).
15.10 «Простыя складанасці» (12+).
15.45 «Натуральны адбор» (12+).
20.25 «Сляды апостолаў». Серыял (12+).
21.30 «Нераскрытыя тайны» (12+).
22.30 «Вяселле і развод» (16+).
23.50 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.30 «Ван Хельсінг». Фэнтэзі (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.20** Выбар капітана Карэлі (16+).
8.50 Сёстры Магдаліны (16+).
11.20 Ва ўцёках (16+).
13.20 Бетховен (12+).
15.10 Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (12+).
20.10 Бетховен-2 (12+).
22.00 Мой хлопчык (12+).
0.00 Бацькі і дочкі (18+).
2.20 1 + 1 (16+).
4.15 Пакой страху (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Гідраўліка (16+).
8.25 Білет на Vegas (16+).
10.20 Выратаваць Пушкіна (6+).
12.05 Востраў (16+).
14.20 Каханне пад прыкрыццём (16+).
**16.20, 4.20** Забытая жанчына (12+).
18.05 Апельсінавы сок (16+).
20.00 Сабібор (12+).
22.20 Маргарыта Назарава (16+).
0.30 М + Ж (16+).
2.20 Масква, я цярплю цябе (16+).

### National Geographic

6.00 Самыя дзіўныя фатаграфіі National Geographic (16+).
6.25 Дзікая прырода Паўднёвай Афрыкі (16+).
7.15 Тайны гуансійскіх пячор (16+).
8.00 Аўта-SOS (12+).
9.30 Адкуль бярууца дыктатары (16+).
10.20 Надзвычайны доктар Пол (16+).
**11.05, 18.45** Настольная кніга дыктатара (16+).
11.50 Ледзяная дарога (16+).
**12.35, 19.40** Востраў бунтароў (16+).
**13.20, 17.15, 20.25, 22.00, 1.10, 4.25** Інстынкт выжывання (16+).
14.10 Дзікі тунец (16+).
**15.40, 1.55** Гарачыя межы (16+).
**16.25, 21.10, 2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
22.45 Забойства Лінкальна (16+).
23.30 Асушыць акіян (16+).
0.20 Гісторыя Бога (16+).
5.10 Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 16.00, 22.00, 3.50** Махінатары (12+).
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** Аўтамайстэрні: Лондан (12+).
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта зроблена? (12+)
**11.00, 20.00, 5.30** Ліквідатар (16+).
**12.00, 18.00, 1.00, 6.20** Зброя будучыні (16+).
13.00 Мадэль для зборкі (12+).
19.00 Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
0.00 Голыя і напалоханыя (16+).
**2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару (16+).
2.55 Музейныя тайны (12+).

СВАЕ СЯРОД СВАІХ

# ...І ЁЛКА НА КАЛЯДЫ

## Лідарам вяскоўцы абралі праўнука царкоўнага старасты, былога брыгадзіра

**ІВАН Суботка — стараста ў Хабовічах зусім не выпадковы. І абралі яго не так, як часам бывае: сабраліся жыхары вёскі на сход, падумалі, памеркавалі, ды ўказалі на некага, маўляў, хай будзе ўмоўны Іван альбо Сцяпан. Івана Нічыпаравіча таксама абралі на агульным сходзе вялікай вёскі. Але яму і альтэрнатывы не было.**


Старшыня сельскага Савета Вера ПІКУЛА і Іван СУБОТКА.

### А мы, што, горшыя?

Іван Суботка адсюль родам, 28 гадоў адпрацаваў менавіта ў гэтай вёсцы Кобрынскага раёна брыгадзірам, афіцыйна пасада называлася — начальнік вытворчага ўчастка. Так што ўсе вясковыя агульныя справы, нават праблемы асобных людзей, раней таксама ўваходзілі ў сферу яго інтарэсаў. Дык вось, калі Іван Нічыпаравіч шэсць гадоў таму выйшаў на пенсію, усё амаль само сабой атрымалася, бо ніхто і не ўяўляў іншага старасту вёскі. Цяпер ён разам з аднавяскоўцамі вырашае праблемы камфортнага пражывання, парадку ў вёсцы, выпасу прыватнага статка ды шмат што іншае.

Можна сказаць, што першай іх агульнай вялікай справай стала добраўпарадкаванне могілак. Гады чатыры таму на вясковы сход прыехаў тагачасны старшыня райвыканкама Аляксандр Зазуля, яму і сталі задаваць пытанні пра нездавальняючы стан месца вечнага спачыну. А кіраўнік раёна прывёў у прыклад іншыя населеныя пункты, дзе жыхары самі сабралі грошы і навялі парадак. Так вырашылі зрабіць і ў Хабовічах. Ставрылі аргкамітэт, які заняўся зборам грошай. Стараста паклапаціўся пра аб'яву ў газеце: такім чынам апавясцілі выхадцаў з вёскі, чые родныя знайшлі спакой на тутэйшых могілках. Варта сказаць, што многія з гараджан адгукнуліся. Словам, сабралі 33 мільёны рублёў (справа была перад дэнамінацыяй). З іх большая частка пайшла на аплату паслуг ЖКГ па зносе дрэў і на ўзвядзенне агароджы. Самай вялікай праблемай усіх сельскіх могілак становіцца менавіта спілоўванне дрэў. Бо яны вырастаюць, становяцца аварыйнымі, пагражаюць помнікам ды надмагіллям. Львіную долю сродкаў патрацілі на іх прыборку. Яшчэ купілі ядахімікатаў і правялі хімпраполку тэрыторыі, бо паміж магіламі вырастае вялікая колькасць непатрэбнай расліннасці. Сабраных грошай хапіла і на новую агароджу. Адным словам, месца спачыну землякоў выглядае цяпер цалкам прыстойна. І людзі ўпэўніліся, што грамадой можна зрабіць добрую справу. На гэтыя могілкі не толькі грошы збіралі, а і выходзілі разам папрацаваць, калі трэба было. І цяпер кожную вясну стараста арганізоўвае суботнікі, каб да Вялікадня навесці парадак.

### Не толькі кот на падворку

Грошы на якую-небудзь агульную справу перыядычна даводзіцца збіраць. Скажам, для выпасу свойскай буйной рагатай жывёлы загон адводзіць мясцовая гаспадарка. А вось для выпойвання кароў давялося пачысціць невялікі вадаём. Гэта зрабілі ў складчыну. Сабралі грошы, нанялі тэхніку, пачысцілі сажалку, і гаспадары сталі спакойна выпускаць карову на выган. Паколькі летась былы калгас далучылі да іншага, стараста ўжо загадзя турбуецца, каб урэгуляваць усе пытанні з пашай. Кароў у вёсцы з насельніцтвам каля 550 чалавек засталося няшмат. Іван Нічыпаравіч і жонка яго Валянціна Сяргееўна вельмі шкадуюць, што цяперашняе маладое пакаленне вяскоўцаў не імкнецца заводзіць сваю гаспадарку.

— Восе перавяжджае сям'я да нас альбо мясцовыя атрымліваюць дом, а на падворку хіба толькі кот гуляе. Не раз цікавілася, чаму не набываеце кароўку, не купляеце свінак для гадоўлі, — разважае жонка старасты. — А тыя ў адказ: у нас зарплата ёсць. Але ж зарплаты ў сельскай гаспадарцы ў асноўным невялікія. Мы вось з мужам працавалі, але ўсё жыццё карову трымалі, іншую жывёлу. У вясковага чалавека спакон веку быў даход ад уласнай гаспадаркі.

— Апошнім часам прагледваецца яшчэ адна тэндэнцыя, — працягвае ўжо Іван Нічыпаравіч. — Маладыя сем'і нараджаюць трое ці больш дзяцей і атрымліваюць кватэры ў райцэнтры. У вёсцы найчасцей няма магчымасці забяспечыць іх жыллём, вось яны і разлічваюць на квадратныя метры ў гарадскіх умовах. А вёска пакутуе ад недахопу рабочых рук, закрываюцца школы і прадпрыемствы сацкультбыту. І гэта няправільна, паводле ацэнкі вясковага старасты.

### Самакіраванне і выхаванне

У Хабовічах ёсць усё для камфортнага пражывання: школа, дзіцячы садок, аддзяленне банка, гандаль і бытавое абслугоўванне. А ў школе зараз навучаюцца 69 дзяцей — з тымі, якіх аўтобус падвозіць з суседніх населеных пунктаў. Гэта будучае Хабовічаў, паказчык іх дэмаграфічнай бяспекі. Пакуль жа хрэсьбіны тут бываюць, на жаль, радзей, чым адпяванні.

Царква ў гэтай вёсцы знакамітая хоць бы тым, што яна ніколі не закрывалася. «Нават пры немцах падчас акупацыі, — расказвае Іван Суботка, — мясцовы святар, якога да гэтай пары ўспамінаюць як надзвычай адукаванага, культурнага чалавека, адстаяў святыню. Мабыць, бездакорнае валоданне нямецкай мовай дапамагло, бо і царкву не закрылі, і вёску не чапалі».

Дарэчы, прадзед Івана Суботкі быў царкоўным старастам. Так што традыцыі ўдзелу ў вясковым самакіраванні ў гэтай сям'і даўнія і трывалыя. Вось і сёлета напярэдадні Каляд бацюшка прыехаў да старасты вёскі з просьбай прывезці ёлку ў храм. Іван Нічыпаравіч звярнуўся ў лясніцтва, дзе і падабралі лясную прыгажуню для святкавання Раства па ўсіх правілах.

Увогуле, пытанні, якія паўстаюць перад старастам, самыя розныя. На адной з сустрэч з прадстаўнікамі райвыканкама Іван Суботка згадаў аб неабходнасці ямачнага рамонту дарогі па цэнтральнай вуліцы. Яму растлумачылі: не хапае сродкаў у гэтым годзе. Але стараста настойвае, бо калі не правесці дарогу, праз год-другі не будзе чаго папраўляць, асфальт разбурыцца. Значыць, пытанне трэба выносіць на разгляд сесіі альбо прэзідыума сельскага Савета.

Больш дробныя праблемы вырашаць стараюцца на месцы. Напрыклад, нядаўна бяда спасцігла аднавяскоўца, згарэў у чалавека дом. Грамада сабрала 900 рублёў у якасці дапамогі. Але ёсць адна закавыка: лад жыцця таго самага пагарэльца выклікае занепакоенасць у аднавяскоўцаў. А ён нават незадаволенасць выказаў, што не аддаюць усю суму грошай на рукі. Стараста ж папулярна растлумачыў: «Калі з табе падарую сваё куртку, чаравікі, яшчэ нешта па дробязі, то гэта рэчы, якімі я распараджаюся асабіста, а грамадскія грошы я магу аддаць толькі ў прысутнасці тваіх сваякоў пад распіску». Калі такая выхаваўчая мера і не паўплывае на светапогляд ды паводзіны грамадзяніна, то дакладна дазволіць «застрахаваць» людскую спагаду.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Кобрынскі раён.*

**Старшыня Дзівінскага сельскага Савета дэпутатаў Вера ПІКУЛА:**

— У асобе Івана Нічыпаравіча мы маем прыклад такога старасты, які яго бачылі распрацоўшчыкі палажэння аб інстытуце старастаў. Па-першае, Іван Суботка — чалавек вопытны ў вырашэнні пытанняў нізавога ўзроўню, ён доўгі час працаваў кіраўніком падраздзялення ў калгасе. Па-другое, ён мае аўтарытэт у вёсцы, можа служыць прыкладам гаспадарання, паводзін, стаўлення да месца, дзе нарадзіўся. Яны з жонкай выгадавалі траіх добрых дзяцей, маюць унукаў. Усё жыццё Суботкі былі працавітымі людзьмі, нават цяпер, на пенсіі, трымаюць гаспадарку, падтрымліваюць узорны парадак на сваёй сядзібе. Ну і Валянціна Сяргееўна, былы галоўны бухгалтар сельгаспрадпрыемства, ва ўсім дапамагае мужу.

ЖЫЛЛЁ МАЁ

# Наваселле пад пагрозай?

## У Прынёманні зніжаюцца аб'ёмы будаўніцтва жылля

**Такі працэс назіраецца ўжо некалькі гадоў, адзначаюць у КДК Гродзенскай вобласці. Калі ў 2014 годзе было здадзена 661 тысяча «квадратаў» жылля, то за 11 месяцаў мінулага года ўведзена ў эксплуатацыю толькі 356 тысяч метраў, што складае 74 % ад гадавога плана. Гэта прывяло да значнага павелічэння чэргаў на кватэры.**

Будаўніцтва жылля з'яўляецца адной з галоўных дзяржаўных праграм у краіне. Згодна з ёй, у рэспубліцы да 2020 года прадугледжана забяспечыць насельніцтва жыллём з разліку 27,3 квадратнага метра на чалавека. У Гродзенскай вобласці ў 2017 годзе ўдалося перавысіць гэты паказчык і дасягнуць 29,7 «квадрата» на чалавека. Разам з тым у рэгіёне не забяспечваецца будаўніцтва запланаваных аб'ёмаў агульнай плошчы жылля. У выніку павялічылася чарга грамадзян, якія маюць патрэбу на паляпшэнне жыллёвых умоў, у тым ліку шматдзетных сем'яў.



Па словах **старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Анатоля ДАРОЖКІ**, з дзяржаўнай падтрымкай пабудавана толькі 70 % гадавога плана. Нізкія тэмпы назіраюцца ў большасці раёнаў Гродзенскай вобласці, а некаторыя наогул не прыступалі некалькі гадоў да будаўніцтва такога жылля.

За 9 месяцаў мінулага года кошт аднаго «квадрата» жылля, пабудаванага з дзяржпадтрымкай, склаў па вобласці 882 рублі. Аднак у шэрагу раёнаў гэты паказчык значна вышэйшы, што недапушчальна. Як вядома, кошт аднаго «квадрата» не павінен перавышаць сярэднямесячны заробак.

**❍ У тэму**

**Магчыма, сітуацыю з жыллёвымі чэргамі палепшыць узвядзенне жылога мікрараёна ў Гродне на месцы былога ваеннага гарадка па вуліцы Лідскай.**

**Ужо закладзены першы пяціпавярховы дом, на чарзе — два сяміпавярховыя. Новы штрых — высоткі. На месцы былых боксаў для тэхнікі з'явяцца тры 19-павярховыя дамы. Высоткі становяцца новым кірункам забудовы цэнтра горада.**

**Усяго тут будзе пабудавана 1620 кватэр. Таксама з'явяцца гандлёва-грамадскі цэнтр, дзіцячы сад, спартыўныя пляцоўкі, стадыён, малыя архітэктурныя формы.**

